Адрас Рэдакцыі: Вільня, Завальная вул. № 1—2.

Складка на год—2 зал., на паўгода—1 зал.
Адна кніжка — 50 гр.

Часапіс выходзіць раз у тры месяцы.

Зьмест кніжкі 3(7) „Калосься“.

Белар. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня, Завальная вул. 1—1.

КАЛОСЬСЕ

БЕЛАРУСКІ ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ ЧАСАПІС

Кніжка 3(7) **1936 г.** **Год II**

МІХАСЬ МАШАРА

МАМЧЫНА ГОРКА

То ня струны зьвіняць,
Галасістыя,
Зашумела жыццо,
Каласістае.

Вецярок да яго,
Заляцаецца
І жартуе, пяе —
Абнімаецца.

Адшуміць, адцьвіце
Жыцьцё хмельнае,
Застанецца па ім,
Казка сьпеўная.

Што прайшло, прабыло, —
Не вяртаецца —
Гэдак казка мая
Пачынаецца,

Што па дзеду дастаў
Яе спадчынай;
Ахрысьціў яе ён
— Горкай мамчынай.

Частка I.

I

Жыў граф,
Магутны граф Лапата,
Ўладар Залешчыны усей
І ганаровы і заўзяты;
З усей магнацкай пыхай тэй.

Абшар палёў яго шырокіх
Сягаў на колькі міль наўкол.
І сьцежкі ўсе, і ўсе дарогі
Вялі у графскі пышны двор.

Палац-замчышча пад гарою
Ў люстэрка возера глядзеў,
А бор сасновы над вадою
Напеў таёмны свой шумеў.

Палац пануры і высокі,
Кругом абведзены мурам,
А пад палацам лёх глыбокі —
Пастрах нявольнікам — рабом.

„Залесьсем“ зваўся двор Лапаты; —
Навокал лес сьцяной стаяў
І узьбярэжжаў пышнай шатай
Палац і горку абнімаў.

І разсьцілаўся ў даль далёка;
На колькі вёрст цягнуўся бор
І ў гушчары яго глыбокім
Не пачынаў зьвінець тапор.

Адзін мядзьведзь, ўладар бязьмежны,
Тут непадзельна панаваў,
Ды чалавек з душой мяцежнай
Часамі праўды тут шукаў.

І бор прымаў усіх ласкава,
Ў каго бруіла бунтам кроў;
Тут панавала волі права
І кпілі ўсе з людзкіх правоў.

А лішніх многа тут бывала, —
Навокал быў тады прыгон.
У лес рабоў нядоля гнала;
І беззаконьне, і закон.

Разбоем часта прамышлялі
У цёмных нетрах удальцы
І з пераможцамі гулялі
Па ўсіх дарожаньках хлапцы.

Пастрах наводзілі часамі
На ўсю ваколіцу яны
І умiралі сьмела самі
Разгульля вольнага сыны.

Эх, гулялі хлопцы
Ды на вольнай волі!
Паміналі помстай
Яны — лёс бяздольны;

Па бары, па нетрах,
Па шляхох — дарогах
Эх, гулялі з ветрам,
Хлопцы ў перамогу.

А па ўсей Краіне,
Белай — Беларусі,
Люд працоўны гінуў
Скотам у прымусе.

Хто хацеў над імі,
Той зьдзекваўся ў волю
І па ўсей Краіне
Стогны йшлі ад болю.

Ад прыгону — гора,
Ад паноў — ад катаў
Сьлёз стаяла мора,
Што мужык наплакаў.

Панавала крыўда
Над Краінай сіняй,
Веяла ад вёсак
Жудасьцю магільнай.

Бор адзін прытулкам
Быў хлапцом мяцежным
І крынічыў гулка
Волі безбярэжжам.

Тут зьвінелі песьні
Поўныя разгулу
І плылі прадвесьняй
Гэнь да сэрцаў чулых!

II.

Магутны надта быў Лапата.
Яго зямель — багаты плён,
Яго уладныя загады —
Усім навокала — закон.

Палац быў поўны слуг пакорных, —
Рабоў бязвольных і нямых
І соткі душ сялян прыгонных:
Старых, малых і маладых.

Усе яны гібелі марна,
Усе былі яны ў ярме,
Усе бяз протасту ахвярна,
Усё жыцьцё нясьлі яму.

А ён, як той павук пачварны,
Усю ваколіцу смактаў.
І з крыўд людзей жывых бязкарна
Сваё багацьце ўсьцяж зьбіраў.

Але ня цешыла багацьце,
Старога графа-багача;
Панурым смуткам, як пракляцьцем,
Спавіта гордая душа.

Ў палацы змрочным адзінока,
Як зданьне, бродзіць граф стары
І нейкі боль мігціць глыбока
Ў вачох патухшых без пары.

Усе дрыжэлі напаткаўшы
Яго сьцюдзёна-шэры ўзрок,
А хто мінаў яго — жагнаўся, —
Як ад бяды ўцякаў на бок.

Казалі, быццам ад пагляду
Нядобра-вострага яго
Ніхто ня быў ніколі рады
І уракалась — дзіцянё.

А ўсё-ж і радасьць зацьвітала,
Цямнелі воч гэтых зрачкі,
Калі часамі, як бывала,
Спаткае погляд ён дачкі.

III.

Адна, адзіная ў Лапаты
Была насьледніца дачка —
Зямлі, палацаў і дукатаў
І мітры графскай багача.

Стары кахаў яе бяз меры,
Яго пацехаю была
І ў адзіноце яго шэрай
Палоскай сьветлай залягла.

Яна адна зьмірала сьмела
Яго разгневаны парыў,
Пры ей душа яго сьвятлела
І смутак сэрца не марыў.

Яна адна глядзела ветла
У вочы страшныя яго
І пад паглядам яе сьветлым
Цьвіло жыцьцёвае цяпло.

І уціхала гневу бура,
Таёмны боль ў грудзёх сьціхаў
І твар старога самадура
Лагодны выраз прынімаў.

Дачку кахаў, відаць, гарача,
Бо толькі з ей ласкавым быў.
Затое колькі крыўд і плачу
Наўкол Лапата прынасіў.

IV.

Дарутай звалася графянка.
Ей год дваццаты ўжо ішоў.
Была прыгожа, як — вясьнянка,
Красой хвалюючая кроў.

Ў вачох іскрыліся вясёлкі,
І сінь, і сьвежасьць васількоў.
Была страйнейшай за сасонку,
Чысьцей — за сьлёзы мужыкоў.

Яна ня знала роднай маткі
Ад самых першых дзён жыцьця,
Яе ўскармілі грудзі мамкі,
Ў палац пакліканай з сяла.

Ішлі гады... Расла Дарута...
Служыла верна мамка ей.

І граф абходзіўся ня крута
З старой слугой дачкі сваей.

Дарута вельмі шанавала
Пястунку верную сваю,
Як маці родную, кахала
Старую мамку па найму.

Але яна усіх кахала,
Кахала кожны сьлед жыцьця,
Яе душа была саткана
З валокан сьветлых пачуцьця.

І вочы сінія красуні,
Яе ружова-белы твар
Не адбівалі яшчэ суму,
Ні сэрца мук, ні цяжкіх мар.

V.

У мамкі — найміткі прыгоннай, —
Графянцы вернай ўсей душой,
Апроч Даруты — быў сын родны,
Які рос з графскаю дачкой.

Старэйшы, праўда, за графянку
На пару нейкіх год ён быў.
Прыстойны надта... Зваўся Янкам.
І сам ня ведаў, кім тут жыў.

У слуг лічыўся чуць ня панам.
У пана, часам, — горш слугі.
Ў задуме нейкай, закаханы,
З сьлядамі суму і тугі.

Аб чым тужыў? — Аб гэтым ведаў
Напэўна толькі бор адзін:
Яму ён толькі шчыра верыў, —
Яму ён быў, як родны сын.

З ружжом набітым за плячамі,
Шмат часу тут праводзіў ён;
Шукаў адказу на пытаньні
І вывучаў жыцьця закон.

Таёмны бор яго ня страшыў, —
Прымаў, як роднага ў сям'ю,
І днём, і ноччу — кожным часам
Ён роднай хатай быў яму.

Сюды ён нёс сваю нядолю
І боль хвалюючых трывог

А бор шаптаў яму пра волю,
Пра хмель жыцьцёвых перамог.

Тут спатыкаў, казалі людзі,
Бунтарных хлопцаў, — ён падчас
У іх сям'і любіў марудзіць,
Гуторыў доўга штось ня раз.

Аб чым гуторылі, — вядома,
Ніхто падслухаць іх ня мог.
Іх вартаваў сасьняк сустромы
На скрыжаваньню ўсіх дарог.

Кахаў ён бор, яшчэ за гэта,
Што тут пад горкай Янка наш
(Шапталі слугі пад сакрэтам)
З Дарутай бачыўся ня раз.

Але нашто рабіць загадку,
Скакаць наперад без пары?
Пачнём лепш дзеі па парадку,
Як расказаў мне дзед стары.

— — — — — — — —

Ёсьць на сьвеце Краіна адна,
Ўся душа яе ў казках жыла,
Вылівалася ў песьнях стагодзьдзі.
Яе скарбы — працоўны народ, —
Быў закінуты гінуць пад плот
І як скот ён гібеў у балоце.
Тут была — і цямра, і бяда,
Тут віла сабе гнёзды жуда,
Панаваў поўнаўладна прымус.
Тут ніколі вясны ня было,
Над ей кпілі — і Бог, і жыцьцё —
Тэй Краінай была — Беларусь.

Эх, Краіна родная —
Беларусь мая,
Вельмі ўжо гаротная
Долечка твая!

Ўсё жыцьцё запраўднае
Абмінала нас,
Груганы крывавыя
Мелі тут папас.

Мы карміліс мроямі,
Духам — жабракі,
І ляжалі гноем мы
Цэлыя вякі.

Толькі падарожнікі —
Лірнікі — дзяды —
Апявалі кожнаму
Вольнасьці сьляды,

Ды складалі казкамі
Дзеі чорных дзён,
Што дарыў няласкавы
Навакол прыгон.

VI.

Ў палацу графскім па пакоях
Снуе таўпа праворных слуг.
Відаць трывожныя настроі
І нябывалы нейкі рух.

Палац прыбраны, як у сьвята,
Вартуе стража на сьцянах
І вецер гойдае заўзята
Панад палацам графскі сьцяг.

Так пышна! Думны граф Лапата
Гасьцей чакае дарагіх: —
Прыедзе сёньнека у сваты
Даруце выбраны жаніх.

Хоць тры разы старэй Даруты, —
Ён гэрбаваны і багат,
І сваявольны і магутны,
З усіх бакоў, як трэ магнат.

Даўно Лапата мроіў скрыта
Аб зяцю гэтакім сабе;
То не які шляхтун - найміта,
А пан, вяльможны пан, як трэ!

Калі ўжо трэ, па волі неба,
Каб род Лапатаў згас на ім,
Ён ўсё аддасьць дачцэ, як трэба,
Дачку-ж аддасьць, як сам, — такім.

І хутка зьдзейсьніцца жаданьне, —
Да мэты надта блізка ён.
Затое пышна так спатканьне
І урачыст гасьцей прыём.

Вяльможны Жаба — рыцар сьмелы —
(Яго шануюць ўсе кругом),
Сягоньня сам з дружынай цэлай
Сюды прыедзе жаніхом.

Хаця Даруты ён ня бачыў
І не знаёмы нават ей,
Ды што дачкі там воля значыць,
Дзе між магнатаў рэч ідзе.

Даўно згадзіўся сам Лапата
Аддаць руку дачкі яму,
А сэрца служыць у магнатаў
Загаду, сіле і найму.

VII.

Пад брамай рог зьвініць прызывам,
(Бягуць да брамы ключары)
І скачыць рэха пералівам
Ў лясным заснуўшым гушчары.

З ласкотам браму адчыняе
Таўпа азброеных людзей,
З паклонам нізкім спатыкаюць
Даўно чаканых тут гасьцей.

І да палацу урачыста
Вядуць дружыну ўсю яны.
На сонцы зброя залаціцца
І зьяе шоўк і галуны.

Зьлязаюць з сёдлаў каля ганку,
Трымаюць коні канюхі.
Рыхтуе дружба для графянкі
Гасьцінцаў многа дарагіх.

Гасьцям дастойным на спатканьне
На ганак сам Лапата йдзе.
Ў пакоі з ветлым прывітаньнем
Іх запрашае і вядзе.

Вясёлы гул... Брэнчаньне зброі...
Шумяць пушыстыя каўры
І скачыць водклік па пакоях,
Кіпіць жыцьцём палац стары.

Наўкол абслугі рой рухлівы,
Гасьцей таўпа ідзе далей,
Вядзе Лапата іх шчасьлівы
З вяльможным Жабам на чале.

Але вось заля сталавая...
Чакае ўжо прыбраны стол
І граф з паклонам запрашае
Гасьцей, — садзяцца навакол.

Садзяцца госьці каля столу,
За крэслам кожнага слуга
І пачынаюць баль вясёлы
На чэсьць сватоў і жаніха.

VIII.

Пры кожным чара залатая
Да краю поўная віна.
Віно, як быццам кроў жывая,
Мяцеліць іскрамі са дна.

Ідзе бяседа каля столу,
І сьмех, і гул, і чарак звон
І нястрыманы і вясёлы
Разгулу панскага разгон.

П'юць за здароўе, па парадку,
Усіх прысутных за сталом,
А графу лёсткі сьцеляць гладка
І славяць чуць не каралём.

Усё пахлебства граф прымае,
Ён задаволен і вясёл,
А чашнік чары налівае
Усей дружыне навакол.

Але вось госьці графа просяць —
Пазваць да іх дачку сюды,
Яе здароўе выпіць хочаць, —
Уся дружына і сваты.

Здароўе выпіць, — заручыцца,
Зложыць у ног яе дары,
А потым знова весяліцца,
Як кажа ім звычай стары.

І даў загад слугам Лапата —
Дачку паклікаць да гасьцей.
Дружына рада... — Сьмех... Віваты.
Віно запенілась быстрэй.

Але прыбег слуга праворны
І графу так адказ дае:
— Даруй, ўладар, слугам пакорным,
— Ў палацы тут — няма яе.

Вясёлы твар пакрыла хмара,
Уладны гнеў блiснуў з вачэй;
Дрыжыць слуга сагнуўшы карак
І ціха стала між гасьцей.

— Ідзі, шукай! шукай усюды!
— Пакліч з палацу слуг сабе,
— І не вяртайся без Даруты,
— О, марны раб, — на вочы мне!

IX.

Заходзіць сонца... Цень лажыцца.
Паўзе ў лагчыны летні змрок.
Чырвонай кроўю залаціцца
Вада люстраная, заток.

Заснула возера ў спакою,
Ад бору цень папоўз даўгі.
І хвалі ціха пад гарою
Заледзь цалуюць берагі.

Ляніва шэпчуцца чароты,
Заледзь калышыцца лазьняк
І нейкай ціхаю пяшчотай
Шуміць задумлівы сасьняк.

Заснула возера... Навокал
Стаіць таёмны бор стары,
Ды залацяцца адзінока
Палацу графскага муры.

Сядзіць над возерам графянка,
Наўзбоч палацу пад гарой.
Над ей сасьняк, а збоку Янка
Гутораць ціха між сабой.

Гутарылі яны
І журчалі славы
Ласкі поўныя,
Хаця думкі плылі,
Як вясеньнія дні
Невясёлыя.

Дарута.

О, ня сумуй, ты мой харошы!
І ня тужы адзіны мой.
Глядзі, які заход прыгожы,
Якая ціш! — Які спакой!..

Заўсёды будзем мы з табою,
Заўсёды будзеш ты маім!
Ніхто, ніякаю цаною
Ня змусіць жыць мяне з другім.

Пацяшала яна,
Хоць была і сама
Смутна — смутная,

Бо у сэрцы жыла
І у вочах цьвіла
Боль магутная.

Моцна верыў ён ей,
Але ніткі надзей
Усе парваліся,

Рвалась сэрца з грудзей
І мацней, і мацней
Бунтавалася.

Янка.

О, не бажыся, дарагая,
Кахаеш — веру, ты мане,
Але ў палацы заручае
Цябе другі ужо сабе.

Ён рыцар знатны і багаты,
Ён — служыць толькі каралю,
Ён, як і ты, — з сям'і магнатаў
І граф цябе аддасьць яму.

Дарута.

Аддаць мяне, — о, мой каханы! —
Аддаць ня зможыць татка мой,
Бо ты мой любы і жаданы
І я мой лёс злучу з табой.

А я адна ў яго на сьвеце,
Адна, — як ты ў мяне адзін, —
І хто-б ня быў там на прымеце,
А будзеш ты Лапаты сын!

Янка.

Дарма ты будзеш паніжацца,
Яны ня ўзрушацца нічым.
Прыдзецца мне з табой растацца:
Ня я, а будзе ён — тваім.

Я раб бяз меньня і аблічча,
А ён вяльможны і багат.
Ня мне з Лапатай парадніцца:
Адзін намер... — чакае кат...

Дарута.

Павер, як татка мой дазнае,
Што ты мне люб, што дораг мне,
Што ты гарача так кахаеш,
То ўся бяда, як сон міне.

Янка.

Надзеяй злуднай і манлівай
Мяне й сябе не спакушай.
Наш лёс няпэўны і здрадлівы
Ты мне у рукі лепш аддай!

Ня можам быць мы тут шчасьлівы,
Тут перамогуць нас яны,
І нат' змагацца мы бязсільны;
Нявольнік — я, яны-ж — паны!

Дарута.

А што ўзамен надзей туманных,
О, любы мой! што маеш ты?
Сваей Даруце, мой каханы,
Адкры замеры і пляны.

Янка.

Што маю я? — Ня надта многа: —
Агонь у сэрцы маладым,
Душу бяз страху і трывогі
І сіл, юнацкіх сіл уздым.

Я ўсё прадумаў і разважыў,
Даўно уцечкі плян гатоў;
Даўно з'яднаў сабе адважных,
Разбойных хлопцаў-бунтароў.

Яны нам выпаўніць памогуць
Усе замеры і пляны,
А там — на новую дарогу —
Да нашай радаснай вясны!

Дарута.

Пакінуць ўсё! Навек растацца,
Што так кахала ўсей душой,
Ісьці у сьвет, ісьці блукацца —
Занадта цяжка, любы мой!

Але, павер, калі ня будзе
Нам выйсьця іншай пуціной,
Тады на ўсё з табой згаджуся:
Пайду усюды за табой.

Янка.

Закрыты сьцежкі ўсе другія
Да шчасьця нашага, павер.
На нашы сілы маладыя
Адна надзея нам цяпер.

Але ідуць сюды вун слугі,
Шукаюць, родная, цябе,
А сэрца, поўна нейкай мукі,
Балюча зноў трывогу б'е.

Эх, чуе сэрца штосьь благое!
Дарута, любая, — пакуль
Яшчэ мы вольныя абое,
Бяжым хутчэй наўцёк адсюль.

Бажуся, — будзем мы шчасьлівы!
На варце шчасьця стану я.
Усе гарачыя парывы
Ўкладу ў полымя пачуцьця.

Зьбяру з пад ног тваіх каменьня,
Наўю прыгожых мрояў сон.
Бяз мук, бяз суму і цярпеньня
Пайдзём ў краіну сьветлых дзён.

Дарута.

Пакінь, о, любы, развражаньне,
Ўцячы заўсёды будзе час.
Пакуль растанемся, Іване,
Вун слугі ўжо чакаюць нас.

Яна пайшла...
А ён астаўся,
З бязсільным бунтам у душы.
Адзін чарот усьцяж шаптаўся
Ў цішы надходзячай начы.

Заходзіла сонца,
Сонца залатое.
Залаціла сосны
Чырвень над гарою.

Адыйшла Дарута,
Да муроў палацу.
Дзесь лунала смутна
Песьня цяжкай працы.

То сьпявалі жнеі,
Ідучы да хаты;
Праклінапі долю
І прыгон праклятьі.

Калыхаліся гукі
Ціха ў летнім змроку,
Боль жывы і муку
Гэнь нясьлі далёка.

Сказ людзкога гора
Слухалі прасторы,
А над цёмным борам
Загараліся зоры.

І глядзелі ярка
З цемнаты высотаў.
Пад гарою Янка
Слухаў шум чаротаў.

Слухаў шум чаротаў,
Слухаў песьні жнеяў
І паўзла маркотна
Ў ціхім задуменьню.

А над ім высока
Сосны баравыя
Ўсьцяж шапталі ў змроку
Шопаты ціхія.

Шопаты і шумы
І напевы гора
Навявалі думы
Чарней хмары чорнай.

(д. б.).

МАКСІМ ТАНК

НАРАЧ

(частка другая)

1.

Нямала зор
апала ў Нарач
шэрай восеньню,
шмат згасла іх начамі цёмнымі, глыбокімі...
часамі вецер цёмна-сінім невадам,
часамі ловіць іх
густымі падвалокамі.

Ды позна паплывуць лянiва хмары сьнежныя
і на азёры,
на затокі
і на сажалкі
апусьцяцца, як з выраю вярнуўшыся,
сьняжынкі — з сінім шумам ветру —
белы кагаркі...
— — — — — — — — — — — —

Нямала песьняў
адцьвітае шэрай восеньню
і топчаць ветры іх з васеньнімі марозамі; —
шмат іх разсеялі
рукамі скутымі,
у даль йдучы шляхамі доўгімі, вастрожнымі...

Але на нівы нашы
песьні яшчэ вернуцца;
зазвоняць чорнымі барознамі,
разорамі,
і зашумяць прасторамі бязьмежнымі,
і засінеюць
васількамі
і вазёрамі.

2.

Думы шэрыя мяцеліца нявесела
на бярозах прыдарожных
дзесь разьвесіла...

„...у людзей палосы доўгія, шырокія
і ляны растуць густыя і высокія;

ткуць дзяўчаты з іх палотны і настольнікі
разшываючы ды ў краскі, ў ясны зоранькі...

У мяне, батрачкі, зрэб'е ды анучанькі
і ад працы, ад мазольнай, баляць ручанькі.

Толькі, кажуць людзі, вочы маю чорныя...
Ў ноч вясеньнюю, у ночку неспакойную

помніць месяц над далёкім ціхім берагам
і як зоры гаварылі з ціхім верасам...

Ды як верас адцьвіла і ночка цёмная, —
асталіся толькі вочы незнаёмага...

Дзе цяпер ён з тымі думамі шалёнымі?..
Мо завеенымі цягнецца дарогамі?..“

А за вокнамі кудлатая мяцеліца
лёнам белым расчасаным
звонка
сьцеліцца.

3.

Сымон

Тацяна!..

Тацяна

Што?..

Сымон

Іванаў бацька
пытаўся, бачыш, як жывецца...
часы няроўныя насталі —
ўсё больш людзей благіх на сьвеце...
Казаў — жаніць, задумаў, сына: —
без гаспадыні, бачыш, блага, —
каб толькі дзе знайсьці дзяўчыну, —
няхай была-б і без пасагу...

Тацяна

Дзяўчат нямала, сьвет вялікі...

Сымон

Яно то праўда... толькі хата
надгніла, наша, пастарэла...
Ды мы і самі небагаты:
вясло з старой падзёртай сеткай,
рызман стары, старая лодка...
Капу гадоў на плечах маю;
жыць, бачыш, гэтак несалодка...
Пайшла... і слухаць нат ня хоча...
Ў суседа, недзе, вечарына.
Ды і мароз усё крапчэе
і вецер ходзе
сіні, сіні...

4.

Заіграла скрыпка
п'яным пералівам, —
так вясна іграе ды пяе жняя;
толькі гэтак ў полі каласістай грывай
зашуміць гаротна, часам сіратліва
паласа стаптаная мая.

Ды шырокім ўзмахам
падхапіў гармонік,
загулі чмялямі тэнары, басы.
Быццам разьвярнуў хтось вышыты настольнік,
ўдарылі ў падлогу, ў печ, у падаконьнік
сьнежнаю завеяй галасы.

Бы сявец зярняты,
пад гарачы золак,
сыпануў на струны звонка музыкант.
І ў адказ цымбалам, на іх шум вясёлы,
віхрам закруціўся збуджаны пасёлак,
ўдарыў у падлогу звонкі град.

5.

Іван

Ну што-ж, Тацяна, пойдзем ў скокі!
Сказаць мо' польку заіграць?
Глядзі, як сяньня закіпела, —
ня могуць ногі устаяць!

Тацяна

Ты п'яны, як кацёл гарэлкі,
Ды адчапіся і ня лезь.
Прапалі сяньня твае дзеўкі, —
ў запечку выспаўся-бы дзесь...

„...Ходзіць вецер ашалелы
і калыша трасьнікі.
Досыць Нарач ўжо цярпела,
галадалі рыбакі!

Быццам хвалі зашумелі
між кудлатых лазьнякоў:
Нарачанскія арцелі
выплывалі на палоў...

Ня шумяць старыя сосны,
ня шуміць зялёны бор;
звонка — сіне рэжуць вёслы
ветрам ўспенены прастор.

Ух — ух, ух — ух!
ух — ля — ух — ля!..“ —
— — — — — —
заліваецца гармонік
падсыпаючы вугля.

Іван

Мяне ня ведаеш, Тацяна, —
ня так ўжо лёгка упаіць.
Па тым, што выпіў і да рана
гатоў нагамі малаціць...

Тацяна

Ідзі, ўжо досыць, не хваліўся-б,
ото-ж наклікала бяду!..

Іван

Пастой, Тацяна, заўтра рана
к' табе у сваты я прыйду...

„...Вось прыйшлі і . . . .
. . . . грамадой.
за вазёры, за вазёры
пастаім мы галавой!

Пастаім і за палеткі
— — — — — —
ёсьць у нас густыя сеткі, —
долю вылавім сваю!

Ды і сілы ў нас нямала
— — — — — — —“
разшумеліся цымбалы,
быццам Нарач ў крыгалом.

З тлуму

Ды ты, Іван, ужо спазьніўся.
Яшчэ як верасы цьвілі
ў Сымона ноч усю, да ўсходу,
сваты гулялі і пілі...

Тацяна

Ты бачыў мо'? Ці піў мо' разам?
Гулялі разам мо' з табой?..

З тлуму

А на Кабыльніцкі гасьцінец
ня йшла з ім полем раніцой?

„...Грамадой пайдзём наперад,
возьмем за грудзі бяду,
і густы закінем невад,
падвалокі пад ваду.

Ціта—ціта, ціта—ціта
Нарач — сіняя вада“...
— — — — — — —
Скрыпка кнігаўкай падбітай
плакаць плакала адна...

6.

Сіратліва, пад дзень апусьцела і хата.
Ноч сінюю — скомканы вехаць
кудлаты —
рэзаў падковай адвостраны месяц.

Неспакойна і вецер пужліва, балюча
шумеў. І зусім без патрэбы
калючай
белай мятлой замятаў даль і неба.
— — — — — — — — — —

Іван

Я адвяду цябе дамоў...

Тацяна

Зайду сама, тут недалёка.

Іван

Ну што-ж, каб ведаў толькі хто,
узяў-бы я яго на вока.
З далёку ён?..

Тацяна

Зლаві, спытай!

Іван

А што-ж, злаўлю... Яшчэ пачуеш.
І ён мо' з тых, што рыбакоў
над Мястрам, Нараччу бунтуюць?..

Тацяна

Ты мо' сінегаловы крук? —
Бунтуюць ўсе, бо есьці хочаць.
Не аддадуць вазёр — само
вясной успомніць Занарочча...

7.

Вазёры, вазёры, вазёры
ў далі забялелі...
І думы кладуцца узорам
па сьнежнай кудзелі.

Далёка, узгоркамі поля
акопы, траншэі, драты —
магілы сусьветнай нядолі
пад сьнегам густым...

Мо вецер з над Рэйну, Дунаю
так плача напевам даўгім,
ці бура ад краю да краю
галосіць з далёкай тайгі...

Вазёры, вазёры, вазёры,
шум бору сасновы;
вузкіх палазінаў узоры
і кій ялянцовы!

Старыя рыбацкія хаты —
пад вокнамі гурбіцца сьнег, —
а вокны з пад броваў кудлатых
глядзяць з пад асьнежаных стрэх.

А ў хатах сьцюдзёных і цесных
гавораць, як выйсьці з бяды...
і з доўгай вазёрнаю песьняй
плятуць невады.

Вазёры, вазёры, вазёры
імглой забялелі;
калышыцца сьнежнае мора
на крыльлях мяцелі.

Да вас я прыплёўся дарогай
працерці занесены сьлед;
з-за кратаў жалезных, з вастрогаў
прынёс вам прывет. —

Ад тых, што вас болей ня ўбачаць,
ад тых, што прыйдуць грамадой
у час буралому гарачы —
вазёры, вазёры — вясной!

Вільня 9. V. 1936 г.

Канец часткі другой.

Веялі ветры...

Далёка над полем, з кажным неасьцярожным шолахам ветру сіняй імглой расьцьвітала жыта.

Хтось пяяў... Абвеяная залатым жытнім цьветабоем песьня то калыхалася на жоўта-зялёных каласістых пералівах, то разам з ветрам каціласяжывымі зялёнымі хвалямі ў даль да цёмнага бору і адбіўшыся ад смалістых пнёў старак зноў плыла туды, адкуль прыйшла, — за Крывы Паравал, а мо' і далей...

...Веялі ветры, веялі ветры...
ды ўжо перасталі...

Прыпамінаецца ўчарашні дзень. Прыпамінаю Міколу... рэвізыю... ліцытацыю Язэпавай гаспадаркі... Міколу ўзялі. Закінуў на плечы торбу з кавалкам хлеба, пару новых лапцей і пайшоў.

— Бунтаваць захацелася! — вечарам, на сяле, гаварыў солтыс Астапчук. — Уладаў не шануюць. Я ўжо ня раз яго перасьцерагаў!

Зноў варочаецца мінулы дзень і прад вачыма ўстае высокая трохі сутулістая постаць Міколы ў шэрай, зрэбнай кашулі, з падарожнай торбай на плячах. Куды яго пагналі?..

Роўнай струной цягнецца праз вёску, праз вузкія шнуры гасьцінец... Шмат хлопцаў, дзяўчат з вёскі пайшло гэтым гасьцінцам у сьвет, ды мала хто з іх вярнуўся! Вось і Даніла ўжо чацьвёрты год, Грышка — сёмы год, як нічога ня піша, Бронька...

Чакае каторага маці. Чакае месяц... год... Часамі далёка выходзе на гасьцінец, доўга глядзіць з пад рукі, аж пакуль не пацямнее ў вачох ці на полі... Не даюць заснуць ім гарачыя сьлёзы на'т у кароткія летнія ночы... А ўсё-ж не аднэй хацелася-б ведаць хоць-бы магілу сына!..

Высака над галавой з крыкам калясяць груглы.

...Веялі ветры, веялі ветры...
ды ўжо перасталі...

Іду на спатканьне песьні а вецер сьмяецца ў калосьсі, наганяе шэра-зялёныя хвалі, якія далёка зьліваюцца з белымі заснуўшымі на небасхіле хмарамі.

...Глядзелі вочы, глядзелі вочы
ды ўжо плакаць сталі...

— Але-ж і голас ты маеш, Кацярына! — Хутка адвярнулася да мяне. Неяк пужліва, быццам крыльлі ластаўкі, падняліся чорныя, простыя бровы. — Ну, зноў быццам у вырай ляцець сабралася? Што?..

— А табе зайздросна?

— Не!.. Мне вось Міколы шкода... Прыйдзе, а цябе і не застане.

— Я і ня зьбіраюся ляцець. І так шмат набадзялася. З малых год усё на службе. А Мікола — гэта другая рэч! Самі вінаваты! Трэба было ня даць, а то, таксама, нібы хлопец!.. — сказала гледзячы на мяне.

Я пачаў тлумачыць, што зусім ня трэба кідацца з кулакамі, калі не пад сілу, а кінуць у бой толькі людзей адданых — гэта ня толькі вялікае глупства, але і праступак...

Неяк ня выходзіла ў мяне, зузім не аб тым трэба было гаварыць. А то нейкія сухія цытаты...

— Пэўна яго выпусьцяць. Нічога не знайшлі. Ну, а плакаць ня варта. Гэта не паможа... толькі што перад гэтым пяяла.

— Усяк можна пяяць. — Села на мяжу, задумалася.

— А ты не патрабаваў-бы ўцякаць? — неяк неспадзявана зьвярнулася да мяне. — Баялася я за яго, як быў ён на волі, а цяпер яшчэ горш. Адважны ён... А ты не патрабаваў-бы ўцякаць? Скажы!

— Каб ведаў, што і мяне хтось чакае, так як яго, уцёк-бы...

З шолахам ветру дацьвітала на вячэрняй зары жыта. Над памежкам адазваліся першыя чэпікі...

— Максім... ідзі дамоў!.. Я яшчэ застануся...

Неспакойна затрымаліся яе вочы на далёкіх вербах, на гасьцінцы, адкуль паўзлі доўгія цені, мокрыя ад апаўшай вячэрняй расы.

Але на шэрым гасьцінцы было пуста... Вецер улёгся, дрэміць. Толькі час ад часу сонна закалышыцца жыта, атрасаючы цяжкія пацеркі сьцюдзёнай расы...

Веялі ветры, веялі ветры...
ды ўжо перасталі...

Вільня, 11. VI. 36.

ОЙ НЯ ГНІЦЕ, ВЕТРЫ...

Ой ня гніце, ветры, вербы над ракою,
над ракою быстрай ня шумі, чарот!
Думала дзяўчына раньняю зарою,
летняю зарою, ды каля варот.

— На кашулі белай васількоў галоўкі,
вышыю пралескі міламу свайму;
або пазалотай, або сінім шоўкам
разатку узорна паясок яму...

Не гадала верба, што лісты у восень
мокрым лістападам з дожджам ападуць.
Раньняю зарою думаць ня прышлося,
сны што палыновым шчасьцем дацьвітуць.

Толькі доля шэрай разаткала ніткай
паясок апошні, вузкі паясок...
Над жыцьцём прыкрытым арыштанцкай сьвіткай
расьцьвітаў зарою сіні васілёк.

Ня кукуй зязюля, хоць так цяжка грудзям,
ня губляй па лесе пер'я галасы.
Той, што паў за волю, аб ім помніць будзем,
будуць помніць — нашы песьні, каласы...

Вільня, 15. VI. 1936 г.

М. ВАСІЛЁК.

* * *

Сьмейся месяц з над палянаў,
што я сяньня маем п'яны —
сьмейся ў вочы!

Стаў душою злодзей нейкі, —
краду песьні ў салавейкі
сярод ночы.

Б'е ў цымбалы вечар чулы,
душа кудрамі трахнула —
ў грудзёх цесна!

Па чаромсе лісьцях кволых
май расплёскаў хмельны солад
у бель — песьню.

Сьпіць працоўная краіна —
дрэме зьвісшы бэз галінамі
панад рэчкай.

З лесу, з гаю на лагчыну
пасьвіць беленькія выгнаў
май — авечкі...

ХоцьТы сьпіш—твой,чую,горды
з майскім гімнам зьліў акорды
дух — старонка!

То вартуе дух народу,
каб спаткаць зару усходу
маршам звонкім.

Бaброўня — май — 1936 г.

* * *

(Прысьвячаю Толі)

Пахавалі з папом і ....
Без апекі і тут ня было —
Ды прыкрыўшы сырою зямліцаю
Разышлося панура сяло...

Ў хворым целе душа была сільная,
Яе выжыла сьмерць без пары...
— Прычытала сястра надмагільную —
Нешта вецер шумеў у бары...

Як хавалі, на захадзе сонейка
Хтось чырвонаю кроўю заліў...
Цяжка дыхала роднае гонейка,
Руні подзьмухам з вузенькіх ніў.

Сьпі, дружок! Над магілаю цеснаю
Ўзыйдуць краскі з пралітых тут сьлёз...
Прыдзе моладзь ня раз к' табе з песьняю,
Кіне буйны у даль адгалос!..

Ад. СТАНКЕВІЧ

Доктар Францішак Скарына і яго культурная праца

З нагоды 450-лецьця яго нараджэньня

(1486—1936)

(Працяг, гл. кн. 2 (6) „Калосься“)

III. Жыцьцё і асоба Фр. Скарыны.

Паводле досьледаў Владзімірова Скарына радзіўся больш-менш каля 1490 г.

Гэтага прыблізнага часу нараджэньня Скарыны трымаліся ўсе вучоныя. Тымчасам у 1925 г. беларускі вучоны М. Шчакаціхін, дасьледжваючы гэту справу, выявіў гіпотэзу, што Скарына радзіўся ў 1486 г. *). Шчакаціхін такім чынам ужо не аб прыблізнай даце нараджэньня Скарыны гавора, але робіць спробу дату гэту усталіць дакладна. Свой пагляд Шчакаціхін апірае на падставе гэрбу Скарыны, які́м было прамяністае сонца чалавечага вобліку, спалучанае з месяцам, так-жа маючае выгляд твару чалавека. Беларускі дасьледчык уважае, што значэньне гэтага гэрбу Скарыны трэба тлумачыць згодна з тагочаснай астролёгічнай ведай, з тагочасным разуменьнем розных сфэрычных зьяваў. Шчакаціхін лічыць, што Скарына радзіўся ў той год, калі было зацьменьне сонца, якое было відаць у Полацку і выбражэньне якога сталася ягоным гэрбам. Такое зацьменьне было там 6. III. 1486 г. Такім чынам гэты дзень і трэба лічыць днём нараджэньня Скарыны.

Нажаль бліжэй пазнацца з доказамі і выясьненьнямі гіпотэзы Шчакаціхіна ня можам, бо не ўдалося мне раздабыць таго нумару менскага „Полымя“ з 1925 году, у якім аб гэтым гаворыцца. Падаю гэтыя весткі на падставе Ул. Пічэты **), які аб гіпотэзе гэтай, а ў зьвязку з ёй і аб часе нараджэньня Скарыны так піша: ...„Гіпотэза Шчакаціхіна вельмі цікавая і заслугоўвае пэўнае ўвагі. Калі яна нават, бязумоўна, і вельмі спрэчная, — дык усё-ж бяспрэчна правільнае прыпушчэньне, што Скарына нарадзіўся некалькі раней, чымся гэта вызначыў Уладзіміраў. Калі прыняць датай 1486 год, дык Скарыне ў момант паступленьня ў Кракаўскі Ўнівэрсытэт было 18 год“.

Але ёсьць урэшце весткі — нажаль не праверанця, — што апошнім часам і сам Шчакаціхін пачынае траціць веру ў сваю гіпотэзу аб часе нараджэньня Скарыны.

*) М. Шчакаціхін. — Калі радзіўся Фр. Скарына („Полымя“ 1925, № 5, бач. 148—152).
**) Ул. Пічэта, 400-лецьце беларускага друку, бач. 317—318. Менск 1926

І так час нараджэньня Скарыны і далей астаецца толькі прыблізным, хоць магчыма бліжэй ён да праўды паводле Шчакаціхіна, як паводле Владімірова.

Затое пэўнай ёсьць яго народнасьць і месца паходжаньня. Па народнасьці Скарына — Беларус, родам з Полацку: *„Із славнаго града Полоцка“*, часта кажа ён аб сабе ў сваіх выданьнях. *„Аз... нарожэны в руском языку“*, так-жа аб сабе выражаецца Скарына ў уступным слове да кнігі Даніеля. У іншых падобных уступных словах завець ён гэтую *„рускую“* мову сваей прыроднай: *„прірожэны язык“*. А ў прадслоўі да сваей першай друкаванай кнігі (Псалтыр 1517 году) Скарына аб'ясьняе сваю дзейнасьць на карысьць Беларускага народу: *„своей братіі Русі“*, дзеля беларускага пісьменства, *„наболей с тое прычыны, іжэ мя мілостівый Бог с того языка на свет пусьтіл“*.

А калі возьмем пад увагу пэўнасьць філёлёгіі і гісторыі, што і гэная мова *„руская“* і гэна „братія Русі“, аб якіх кажа Скарына, гэта ёсьць тая-ж сяньняшняя ў сваей аснове беларуская мова і той-жа сяньняшні Беларускі народ, дык ня можа быць у нас сумляваньня аб тым, што сапраўды Скарына вядзе сваю гутарку аб беларускай мове, аб Беларускім народзе і што ён сам Беларус „прірожэный“.

Якой быў веры Фр. Скарына, — праваслаўнай, ці каталіцкай, — напэўна такжа няведама.

Яго першае імя Юры (Георгі), знанае пераважна (хоць ня выключна) сярод праваслаўных, далей той факт, што, як кажа Владіміров у сваей монографіі аб Скарыне, у канцы XV стаг. у Полацку ня было яшчэ ніводнага каталіцкага касьцёла, а ўсе Палачане былі Беларусы праваслаўныя, а так-жа ўрэшце ўся літаратурная дзеяльнасьць Скарыны і прыгатаваньне да яе — прамаўляюць за праваслаўную веру Скарыны.

З другога-ж боку, яго другое (пазьнейшае) імя: Францішак, імя пераважна каталіцкае, яго пастаянная лучнасьць з Вільняй і ўзгадаваньне ў каталіцкім Кракаве і каталіцкай заграніцай, а так-жа той факт, што ў XV і XVI стаг. на Беларусі былі староньнікі уніі Каталіцкага Касьцёла з Праваслаўнай Царквой, якую (унію) пашыраў у нас вядомы маскоўскі ўцякач мітрапаліт Ізыдор, — прамаўляюць у некаторай меры і за веру каталіцкую Фр. Скарыны.

Былі і такія ўрэшце дасьледчыкі, якія ўважалі Скарыну за протэстанта, а гэта на тэй падставе, што ў ягоны час у Заходняй Эўропе а так-жа і Беларусі шырылася, як ведама, рознага роду протэстанцтва: гусытызм, лютэранізм, кальвінізм, соцыянізм. Доказам, між іншым, яго протэстанцтва было і тое, што ён іменна тлумачыў Біблію на жывую мову Беларускага народу, што сапраўды ў тым часе рабілі протэстанты для розных народаў.

Владіміров выказаўся за тое, што Скарына быў праваслаўны. За ім і большасьць вучоных трымалася гэтых паглядаў. Пагляд гэты аднак быў нанова заквэстыянаваны ў 1925 г., калі

навуковы рух аб Скарыне значна ажывіўся з нагоды 400-лецьця беларускага скарынаўскага друку. На гэты раз у справе веры Скарыны выразны і рашучы забраў голас успомнены Г. Ловмяньскі, крытык маей аб Скарыне брашуры. Вучоны гэты рашуча выказаўся за каталіцтвам Скарыны *). Галоўныя яго доказы гэткія: культ сьв. Юрага, пашыраны прадусім на Усходзе, ня быў чужым на Захадзе і ў Польшчы. Скарына, імем Юры (вобак з імем Францішак) названы толькі раз у прывілеі караля Зыгмунта І, выданым яму 25. XI. 1532. Скарына, называны колькі разоў па імі і прозьвішчу ў актах унівэрсытэцкіх у Кракаве і ў Падуі, у мэтрыцы Кароннай і Літоўскай, а прадусім у сваіх уласных выдавецтвах, нігдзе Юрым не завецца, а толькі Францішак. Справу гэту Ловмяньскі рашае наступным домыслам: „O rozwiązanie zagadki nie trudno. Zestawiając wzmiankę z innym przywilejem króla Zygmunta I, o cztery dni wcześniejszym, spostrzegamy, że przy wymienieniu po raz pierwszy nazwiska Skoryny dodaje on tytuł: „egregium et famatum Franciscum Skorina de Poloczko medicinae doctorem“, w przywileju natomiast z dnia 25. XI. razi brak słówek grzecznościowych, mówi on wprost: „Georgii Franciscii Skorina de Poloczko artium et medicinae doctoris“. Z porównania łatwo się domyśleć — канчае свае вывады Ловмяньскі — iż w ostatnim dokumencie pisarz przekręcił słówko „egregii“ na Georgii“...

Вышла, праўда, даволі зручна і дасьціпна, але каб навукова праконваюча, то не скажу.

Далей той-жа Ловмяньскі, а ў 1933 годзе і кс. др. К. Кантак **) Скарыну залічаюць у каталікі на тэй падставе, што каталіцтва лацінскае было ў Полацку ўжо ў канцы XV стаг. Кантак аб гэтым кажа катэгорычна, нажаль не падаючы ніякіх довадаў: „Między nawróconymi znalazła się także rodzina Skorynów, jak o tem świadczy imię znakomitego wydawcy“.

Найнавейшы доказ за каталіцкасьць Скарыны знаходзім у рэцэнзіі М. Войцехоўскай на кніжку Л. Абрамовіча „Cztery wieki drukarstwa w Wilnie“ ***). Доказам гэтым мае быць факт, што Скарына, пасьля таго як кінуў друкарскую справу, быў сакратаром і лекарам віленскага каталіцкага біскупа. Весткі гэтыя М. Войцехоўская знайшла ў пазнанскім меставым архіве.

Кс. Ул. Талочка зьвярнуўся ў гэтай справе да ведамага дасьледчыка гісторыі нашага краю кс. праф. др. Я. Фіялка ў Кракаве. Адказ быў наступны: ...„Mam zaszczyt donieść, iż wywód prof. H. Łowmiańskiego w Ateneum Wileńskiem z 1925 r. jest aż nadto przekonywujący. Stwierdzono też w r. 1926 (Kwartalnik Historyczny XL), iż pan dr. Franciszek Skoryna jest sekretarzem i lekarzem biskupa wileńskiego w r. 1532“.

*) „Ateneum“... бач. 163—164.

**) Ks. dr. K. Kantak — Bernardyni Polscy, паводле: Ул. Талочка—Да справы веравызнаньня Фр. Скарыны („Калосьсе“ 1935, кн. 3).

***) „Kwartalnik Historyczny“, XL, 1926.

Пэўне-ж, факт, што Скарына быў у каталіцкага біскупа сакратаром і лекарам прамаўляе за ягоным каталіцтвам, але ня так узноў рашуча і безапэляцыйна, як гэта робяць польскія гісторыкі. Мог Скарына быць праваслаўным і разам мець працу напр. у канцэлярыі біскупа і лячыць яго. Быў гэта час, палавіна XVI ст., калі вобак з рэлігійным фанатызмам у нашым краі спатыкаліся лібэральныя і толеранцыйныя адносіны.

Ведамым ёсьць далей, што ў аднэй з праваслаўных кансысторыяў на заходне беларускіх землях сяньня працуе як урадовец каталік (з паходжаньня беларус, з пераканаьня паляк). Калі-б зайшла патрэба ў будучыне, гісторык гэтага каталіка на падставе ягонай працы ў праваслаўнай кансысторыі мог-бы ўважаць за праваслаўнага, але, як бачым, цалком мыляўся-б.

Аб гэтым маглі-б вырашыць: мэтрыка і аўтэнтычныя словы ці чыны самога Скарыны, або яго сучасьнікаў. Пакуль гэтага няма — справа веры Скарыны астаецца далей нявырашаная.

Вырашэньне гэтай справы, пэўне-ж, мела б важнае значэньне: яно дало-б навуцы новае аб Скарыне сьвятло. Але гэта, памойму, справа другарадная. Гэтым польскім вучоным, якія так цікавяцца верай Скарыны і якія даволі з лёгкай рукі залічаюць яго ў каталікі, робяць гэта ў пераважнай меры з матываў не навуковых, а палітычных. Яны трымаюцца старога прынцыпу: калі хто каталік, дык той і паляк. Паляком (і каталіком) Скарыну даўней лічыў Ліндэ, Лелевэль, Вішнеўскі, Крашэўскі *), паляком яго ліча сяньня Ловмяньскі, Кантак і Фіялак, які кажа: „nasz dr. Franciszek Skoryna“...

Для нас-жа беларусаў вера Скарыны прынцыповага значэньня ня мае. Ці ён быў праваслаўным, ці каталіком, ці протэстантам, ці нават уніятам, што, на мой пагляд, найменш праўдападобна, ён не перастае быць агульна-беларускім вялікім культурнікам, які найважнейшую на той час крыніцу прасьветы, Біблію, пераклаў на тагочасную жывую літаратурную беларускую мову.

Аб бацькох Фр. Скарыны і аб яго жыцьцёвых варунках бадай што няведама нічога. З актаў XVI ст. ведама, што сям'я Скарынаў мела ў Полацку нярухомую маемасьць і была ў зносінах з Вільняй, Чэхіяй і з Нямеччынай.

Зносіны гэтыя мелі вялікае значэньне ў жыцьці Скарыны. Праз іх сям'я Скарыны мела пастаянны стык з культурай Заходняй Эўропы, а прадусім з культурным цэнтрам краёвым, Вільняй. З Вільні ў той час, як ужо ведаем, многія Беларусы і Літоўцы езьдзілі на навуку заграніцу агулам, а найбольш у польскі Кракаў.

Дык вось-жа і Фр. Скарына, атрымаўшы пачатковую навуку дома, маючы якіх гадоў 16—18, апынуўся там-жа.

У рукапісных актах Кракаўскага унівэрсытэту 1504 г. гаворыцца *„Franciscus Luce de Ploczko, solvit 2 gr.“*, што пабеларуску знача: Францішак сын Лукаша з Полацка заплаціў 2 грошы. Гэтыя два грошы заплаціў ён, як уступную плату за унівэрсытэт.

*) 400-лецьце... бач. 287.

Пасьля двух гадоў навукі ў Кракаве ў 1506 г. Фр. Скарына дастаў там першую вучоную ступень бакалара філёзофіі. Аб гэтым здарэньні ў жыцьці Фр. Скарыны ўспамінаецца ў тых-жа актах унівэрсытэту, у якіх гаворыцца, што ў 1506 г. між іншымі атрымаў успомненую ступень *„Franciscus de Poloczko, Lithuanus“*.

У 1506 г. Фр. Скарына пакінуў Кракаў і праз шэсьць гадоў негдзе вучыўся заграніцай багаслоўя і мэдыцыны. Але гдзе — няведама. Тут недзе Скарына здабыў новую вучоную ступень — доктара „eximiarum artium“ *). Апрача навукі, Скарына прыглядаўся да культурнага жыцьця Эўропы і пазнаваўся бліжэй з друкарскай штукай.

Да слаўнай у той час вучэльні залічаўся ўнівэрсытэт у Італіі, у месьце Падуі. Найбольш ён славіўся мэдыцынай. Вось-жа наш Скарына ў 1512 годзе і прыбыў сюды, дзе і здабыў — першы на Усходзе Эўропы — доктарат мэдыцыны. Пасьля гэтага Скарына зваў сябе: „в лекарскіх науках доктор“ або „в науках вызволеных і лекарскіх доктор“.

Пасьля гэтага ўзноў заціраецца сьлед Скарыны. Малады доктар пашоў, пэўна, пехатой дамой, да Полацка, і тут пачаў шукаць грашовых спосабаў, каб распачаць друкаваньне так патрэбных Беларускаму народу кніжак. Пабываў ён так-жа і ў Вільні, сталіцы Беларуска-Літоўскай дзяржавы, і пазнаёміўся з многімі віленскімі мяшчанамі і братчыкамі, на кошт каторых пасьля і друкаваў свае кніжкі.

І вось, Скарына задумаў вялікую думку — перакласьці ўсю Біблію на тагочасную беларускую літаратурную мову і надрукаваць яе.

Дабыў сабе Скарына патрэбныя рукапісы і каля 1516 году паехаў у Чэхію, да Прагі. Кракаў абмінуў Скарына, успамінаючы, відаць, сумны канец Фіёля.

У 1517 г. Скарына ўжо знаходзіцца ў Празе, дзе працуе над перакладам біблейскіх кніг і над іх надрукаваньнем. Знайшліся асобы, што памагалі Скарыне, чым маглі. Прадусім былі яму памоцны, як грашмі, так, магчыма, і рукапісамі і маральнай парадай, віленскія мяшчане: Богдан Онькаў, Якуб Бабіч і інш.

Скарына залажыў у Празе ўласную друкарню і ў найлепшых нямецкіх майстроў заказаў зрабіць чаранкі (літары) і патрэбныя друкарскія прылады.

Кнігі выпускае Скарына ў сьвет адна за аднэй. Першым паявіўся найбольш патрэбны ў практыцы Псалтыр 6-га жніўня 1517 г., за ім усе іншыя. Ад 1517 да 1519 гг. — значыць за два гады — Скарына ў Празе выпусьціў 22 кніжкі.

*) Гэта знача — сямі свабодных навук.

Аднак, праца Скарыны ў Празе — па выданьні ўспомненых кніжак — у 1519 г. спынілася. Відаць, не сядзелася яму там, цягнула яго на бацькаўшчыну. *„Людзі,* — кажа Скарына, — *ігдіе зродiлiся і ускормлены суць, по бозе, к тому месту велікую ласку імаюць“*. Закласьці друкарства на роднай зямлі, відаць, было галоўнай мэтай Скарыны.

Дык пакідае наш друкар Прагу, забірае з сабой кніжкі, чаранкі, друкарскія прылады і перабіраецца ў Вільню і тут у доме бурмістра Якуба Бабіча закладае друкарню, у якой друкуе ў 1525 г. *„Апостола“* і *„Малую Подорожную Кніжыцу“*.

І вось, на гэтых дзьвох кніжках нажаль і спынілася ў Вільні друкарска - выдавецкая і літаратурная дзеяльнасьць Скарыны. Што за прычыны? Напэўна няведама, але мусілі іх быць многа і featнага роду.

Між іншым ня спрыялі працы Скарыны яго асабістыя варункі. Ён абяднеў у Вільні цалком. Брат Скарыны, Іван, з якім Францішак меў супольную маемасьць, заблутаў свае справы, а гэтым самым і матар'яльнае палажэньне свайго брата. Пачаліся судовыя працэсы, якія мала таго, што адрывалі Скарыну ад культурнай працы, але давялі да таго, што маемасьць яго была сканфіскавана. Судовая цяжба цягнулася ад 1529 да 1532 г.

З успомненай рэцэнзіі М. Войцехоўскай у „Kwartalniku Historycznym“ даведваемся яшчэ, што брат Францішка Скарыны, Іван, гандляваў у Пазнані скурамі. У 1529 г., калі Іван памёр, Францішак прыбыў у Пазнань. Пасьля брата асталося шмат скураў і даўгоў. Францішак узяў з іх сабе 2.500 за доўг (11 коп літоўскіх грошаў), які яму быў вінен Іван.

У сакавіку 1532 г. Фр. Скарына апынуўся ў пазнанскім вастрозе за даўгі брата Івана, які быў вінават двум жыдом 412 зл. польскіх. Каралеўскі загад арышту Скарыны падпісаны 15. II. 1532 г.

Аб гэтым здарэньні даведаўся Раман Скарына, які быў у той час у Гданску. Ён у красавіку прыбыў у Пазнань і стараўся аб звальненьні Францішка. Звальненьне наступае ў палавіне чэрвеня.

30-я гады XVI ст. самы цёмны пэрыяд у жыцьці Фр. Скарыны. Крыху яго асьвятляюць дакумэнты Коенігсбэрскага архіву, апублікаваныя Мілавідавым *). Гэтыя дакумэнты, пісаныя ў лацінскай мове, ад прускага караля Альбрэхта.

Першы дакумэнт з 16. V. 1530. У ім Альбрэхт паведамляе віленскага ваяводу Гаштольда, што Скарына перасяліўся ў Коенігсбэрг, але што розныя прыватныя справы, жонка і дзеці, пакінутыя ў Вільні, прымушаюць яго зноў вярнуцца сюды. З гэтай прычыны кароль просіць ваяводу дапамагчы Скарыне ў яго справах. Другі дакумэнт, з тэй-жа датай, ёсьць прапускны ліст, або пашпарт для бесперашкоднага пераезду Скарыны. Трэці дакумэнт з датай 18. V. 1530 г. — гэта ліст Альбрэхта да Віленскага Сэнату. Кароль, адпускаючы Скарыну назад у Вільню з прычын сямейных, просіць Сэнат быць справядлівым у адносінах да яго і зьвярнуць яму сканфіскаваную ў яго маемасьць. Чацьвёрты дакумэнт з 26. V. 1530 г. гэта ўжо абвінавачваньне каралём Скарыны. У гэтым дакумэнце кароль зварачваецца да Ваяводы Гаштольда са скаргай на Скарыну, што ён забраў аднаго жыда, які быў у Альбрэхта доктарам і адначасна друкаром, і што гэтым Скарына зрабіў яму, каралю, вялікую шкоду.

*) Известія Отд. Р. Яз. и Слов. Р. Ак. Н. 1917, кн. 2, 221—226.

Можна дагадвацца, што Скарына забраў з сабой гэнага жыда - друкара, каб прадоўжваць сваю выдавецкую працу і пасьля 1525 г., гэта знача пасьля выданьня ў Вільні „Апостала“ *).

А вось апошнія найнавейшыя весткі аб Скарыне, якія здабыў праф. Флоровскій у Празе. У Вільні Скарына прабываў ад 1530 да 1534 г. У 1534 г. Вільню пакінуў і прыбыў у Прагу. Быў тут надворным лекарам караля (Фэрдынанд І Габсбурскі — 1527 — 1564). У Празе аставаўся аж да сьмерці. Памёр там-жа ў 1551 г.

Астаецца аднак нявыясьненым, як Скарына, прабываючы паводле праф. Флороўскага ў Вільні ад 1530 да 1534 г., у 1532 г., паводле вестак М. Войцехоўскай, апынуўся ў пазнанскім вастрозе. Але гэтая няяснасьць, на мой пагляд, хутчэй характару праўнага, як фактычнага. Паехаў Скарына ў 1532 г. у Пазнань у справах даўгоў брата і там быў прыарыштаваны.

І так бачым, што за апошнія дзесяць гадоў навука здабыла аб Скарыне некаторыя новыя і дужа цэнныя весткі. Аднак шмат што і далей з жыцьця Вялікага гэтага Беларуса астаецца няведамым. Але ідэі яго нам добра ведамы. Пасьля доўгіх ліхалецьцяў Беларускага народу, пасьля доўгай яго сьпячкі, ідэі Скарыны ўваскрэсьлі да жыцьця нанова і жывуць сяньня сярод нас.

Астаткі друкарні Фр. Скарыны ў 1575 г. перайшлі да Мамонічаў у тэй-жа Вільні, каторыя далей друкавалі беларускія кніжкі. І сяньняшняе друкаваньне беларускіх кніжак — далейшы этап магутнай ідэі Скарыны, ідэі служэньня Беларускаму народу.

IV. Ідэовасьць працы Фр. Скарыны.

Фр. Скарына, як беларускі патрыёт і чалавек усестаронна асьвечаны, гараваў горам свайго народу і цешыўся яго радасьцяй і шчасьцем. Ён заўсёды ясна бачыў усе недастаткі культурнага жыцьця Беларускага народу, а бачыў іх яшчэ ясьней, калі раўнаваў сучаснае яму жыцьцё Беларусі з жыцьцём заходняй Эўропы.

Ідэовы аднак бок культурнай працы нашага вялікага Скарыны, з прычын палітычных той-жа Ловмяньскі асьвятляе тэн-

*) М. Піотуховіч — Фр. Скарына (400-лецьце... 169—170).

дэнцыйна і старонна. „Przypisywanie Skorynie patrjotyzmu ruskiego — кажа ён — czy zamiłowania do ruskiego języka, opiera się na nieporozumieniu. Przecież Psałterz, który Skoryna przeznaczał do nauki czytania i dobrego „mówienia“ został wydany w c-słow. języku, również Małaja podorożnaja knižica, której tytuł wskazuje, że miała służyć podróżnym, jako modlitewnik. Nie ruski wobec tego ale c-słow. język popularyzował Skoryna! Dlaczego jednak tak często wspominał on o ruskim języku, dlaczego mówił, że jednym z powodów wydania Biblii po rusku było to, że się „w ruskim języku urodził“? Złożyły się na to dwie przyczyny.

Drukarnia Skoryny, jak przeważnie tego rodzaju zakłady, jeżeli była w intencjach przedsiębiorców placówką kulturalną, to na drugim albo na trzecim planie. Przedewszystkiem zaś była ona przedsiębiorstwem dochodowem. Skoryna poza działalnością wydawniczą niczem się nie zaznaczył na polu życia umysłowego, nie mamy powodów do uważania go za świadomego szermierza oświaty na ziemiach ruskich, wstępy i zamknięcia do wydawnictw nie zawierają ani śladu myśli oryginalnej, są naracją a częściej plagjatem z pism średniowiecznych autorów chrześcijańskich. Nie z pobudek cywilizacyjnych założył on drukarnię, lecz dla zdobycia majątku, chociaż miał zupełne prawo pochlebiać sobie, że się trudzi dla „dobra pospolitego“. Również nie dla idealnych, lecz dla materjalnych względów finansował nakład praski mieszczanin wileński Bohdan Onkowicz. Trzeba też przyznać, że przedsiębiorstwo było zakrojone na szeroką skalę, skoro po tranzlokacji do Wilna założono tam nawet papiernię. Warunkiem powodzenia wydawnictwa było uprzystępnienie go dla ludzi pospolitych, jak się sam wyraża Skoryna. Usiłował on dopiąć celu, wprowadzając ruskie zwroty, tłumacząc wyrazy ciemne i niezrozumiałe, poprzedzając księgi wstępami, mającemi zainteresować i zachęcić do lektury czytelnika. Nie dość na tem, zdobywa się on na sui generis reklamę i nazywa swe wydawnictwa „ruskiemi“, chociaż tylko nieprzyjaznym warunkom zawdzięczać należy, że były one ruskiemi faktycznie nie z imienia. Tę „ruskość“ przeznaczoną dla społeczeństwa, nie znającego języka c-słow., podkreśla dobitniej, niż wypada, sądzac, że zdobędzie tą drogą czytelników, zachęconych popularnością wykładu Mieliśmy już dosyć dowodów, że sam on dbał bardzo mało o ruski charakter swych wydawnictw.

Z drugiej strony, będąc katolikiem, uważał za stosowne wskazać na powody wydania Pisma św. „w ruskim języku“, co mogło grozić przykremi konsekwencjami, jeśli nie w Pradze, to po powrocie do kraju, z którym stosunków nie zerwał. Tłumaczy więc, że jest rusinem, że język ruski jest jego rodowitym, że chęć zaznajomienia swej braci — Rusi z Pismem św. skłania go do podjęcia wydawnictwa w jej języku“ *).

Вось на якіх падставах Ловмяньскі адмаўляе нашаму Скарыне ідэовасьці. Адмаўляе ён яе на падставе чыстых суб'ектыўных вымыслаў, якія яўна стаяць у супярэчнасьці з фактамі вялікай культурнай ідэовай працы Скарыны, у супярэчнасьці з славамі самога Скарыны аб гэтай працы і ўрэшце ў супярэчнасьці з самымі сабою. Тое ўсё, што Ловмяньскі вышэй сказаў проціў ідэовасьці і патрыотызму Скарыны, фактычна больш прамаўляе за, як проціў. Гэнае ягонае „проціў“ ярка тэндэнцыйнае і беспадстаўнае. Калі-б Скарына зрабіў тое, што ён зрабіў, для польскай культуры, дык быў-бы дужа ідэовы і патрыот, а затым, што ён гэта рабіў для беларускай культуры, дык ён гандлёвы дзялец і толькі.

*) Ateneum... 175—176.

Разважаючы так, як Ловмяньскі аб Скарыне, можна было-б ня ўбачыць ідэовай, высока патрыотычнай старыны ані ў слаўных літоўскіх нашэльнікаў кніг („knygnešai“), што друкавалі літоўскія кніжкі ў Літве Прускай і разносілі іх па ўсей Літве іншай, ані так-жа ў ва ўсіх тых нашых сучасных і мінулых выдавецтвах, якія нясьлі і нясуць асьвету, беларускую нацыянальную сьведамасьць і беларускі патрыотызм. Сказаць, што гэта ўсё было роблена даўней і робіцца цяпер для матар'яльнага зыску, было-б яўнай недарэчнасьцяй.

V. Мова Скарынаўскіх друкаў.

У якой меры можна лічыць мову Скарыны беларускай, шмат дае сьвятла Язэп Воўк-Левановіч*). Вось ягоныя думкі. „Школьная асьвета ў Скарынаўскую эпоху насіла чыста царкоўны характар: ў школах Беларусі і Украіны вучылі мовы не беларускай і не ўкраінскай, але царкоўна-славянскай. Для гэтай мэты ўжывалі пераважна Псалтыр і іншыя біблейныя і агулам набожныя кніжкі. У выніку гэтага царкоўна-славянская вымова і словы як у гутарцы людзей, так і ў пісьме мяшаліся з жывой народнай мовай. Але і жывая мова ў людзей граматы, у людзей адукаваных так-жа рожнілася ад мовы народу, ад мовы масаў, як гэта бывае і цяпер. Жывая мова людзей адукаваных мусіла быць перасыпана славамі царкоўна-славянскімі, якія ў народзе былі мала ведамы, або і сусім няведамы. У гэткай жывой беларускай ці ўкраінскай мове, у мове людзей граматы, і пісаліся розныя грамадзкія акты і граматы.

Сусім не такая мова кніг тае-ж самае эпохі, але царкоўна-рэлігійнага зьместу. Гэтыя кнігі напісаны або сусім у чыста царкоўна-славянскай мове, або ў царк.-слав. мове з большай ці меншай дыялектычнай ахварбоўкай — беларускай ці ўкраінскай — у залежнасьці ад месца напісаньня.

Такая самая мова і ў выданьнях Фр. Скарыны; як паказвае аналіз, гэта ў большасьці царкоўна-славянская мова з моцным элемэнтам жывой беларускай мовы і з сьлядамі літаратурнага ўплыву чэскай і польскай мовы“ **).

*) Я. Воўк-Левановіч — Мова выданьняў Фр. Скарыны (400-лецьце...).
**) Там-жа, бач. 263.

Далей чытаем у Воўк-Левановіча: „Маючы на ўвазе даць праваслаўнай беларускай царкве і народу мала вядомыя ім кнігі сьв. пісаньня ў богаслужбовай мове, Скарына блізка цалкам пакінуў нязьменнымі тэксты Апостала 1525 г. і Псалтыру 1517 г., бо меў іх пад рукою ў царкоўна-славянскай мове, а адрыўкі з старазаконных кніг з царк.-слав. парэмейніка (выпісы, Ад. Ст.) толькі паправіў з чэскім тэкстам біблії 1506 г., г. знач., пераклаў з чэскай мовы толькі тое, чаго ня меў пад рукамі ў царк.-слав. мове... *).

„Выложил“ — кажа Скарына. „Нам здаецца, што ён хутчэй, па сутнасьці справы, меў мэтай не пераклад цалкам, а толькі пераклад няясных і незразумелых слоў і выразаў царк.-славянскіх і грэцкіх...

„Повелел есми Псалтырю тиснути рускими словами а словенским языком“. „Сэнс гэтых слоў мы можам, у вагульным, пашырыць і на ўсе выданьні Скарыны...

„Гэтак мы можам быць пракананымі, што Скарына, выдаючы свае кнігі „людзям посполитым к доброму научению“, клапаціўся толькі аб тым, каб, не зьмяняючы царкоўна-славянскай асновы тае мовы, якая была пашырана ў рэлігійным ужытку праваслаўных беларусаў, даць рэдакцыю багаслужэбных і рэлігійных кніг, зразумелую для сваіх чытачоў“ **).

З гэтага якраз і вынікае той беларускі патрыотызм і тая ідэовасьць Скарыны, аб якой гаварылі мы ў папярэднім разьдзеле, а якой пярэча Ловмяньскі.

Урэшце, кончыўшы свой агляд мовы Скарыны, Воўк-Левановіч так кажа: „Такім чынам, пазнаёміўшыся з асаблівасьцямі фонэтыкі і морфолёгіі Скарынавай мовы (што я для нястачы месца прапускаю, Ад. Ст.), мы бачым, што царкоўна-славянская аснова яе пад напорам жывога моўнага мышленьня — можа самога Скарыны, як рэдактара, а можа й друкароў — прарываецца і паказвае нам такія гукі і формы, якія мы чуем у беларускай мове ў нашы дні...

„Жывая беларуская мова эпохі Скарыны ў большасьці сваіх характэрных рыс — фонэтычных, морфолёгіі і слоўніка — была такою, якою мы яе ведаем цяпер“ ***).

VI. Значэньне працы Фр. Скарыны.

Значэньне Фр. Скарыны для беларускага народу вялізарнае.

Скарына — прадвесьнік беларускага сучаснага адраджэньня. Праўда, па ўздойме падышоў заняпад і толькі аж у XIX ст. узноў аджыла беларуская нацыянальная думка. Але тут былі прычыны палітычнага вонкавага характару.

„Здаецца, што цяпер ужо ня прыходзіцца даводзіць таго вядомага факту, што галоўная роля ў адмоўным уплыве на асьвету

*) Там-жа, бач. 267.
**) Там-жа, бач. 268.
***) Там-жа, бач. 282, 283.

і мову Беларусі належыць тым гістарычным падзеям, што зьявіліся вынікам унутраных палітычных і нацыянальна-рэлігійных узаемаадносін на соцыяльна-экономічным грунце ў Літоўска-Беларускай дзяржаве; гэныя падзеі прывялі да таго, што Літоўска-Беларуская дзяржава страціла спачатку сваю сувэрэннасьць, а пасьля і культурна-нацыянальную самастойнасьць, падпарадкаваўшыся й палітычна й культурна Польшчы. Ня будзь гэтых палітычных падзей, не падлягае ніякаму сумненьню, што афіцыяльная і кніжная беларуская мова дачакалася-б сваіх рэформаў, якія давяршылі-б справу, пачатую Скарынай, — справу збліжэньня кніжнай мовы з жывою беларускай моваю. Толькі палітычныя падзеі былі прычынай таго трагічнага здарэньня, што беларуская літаратурная мова, замест таго, каб рэфармавацца на здаровых асновах minimum 200 год таму назад, стала на гэты шлях толькі ў нашыя дні“ *).

Сапраўды меў Скарына пачуцьцё нацыянальнае. „У сярэдніх вяках панавала адзіная космополітычная культура; гуманістыя выяўляюць вялікую цікавасьць да нацыянальных адзнак. Ужо Дантэ, які стаіць на рубяжы сярэднявечча і рэнэсансу, у сваім трактаце „de volgari eloquio“ даводзіць, што жывая італьянская мова вышэй за мёртвую лацінскую. Па яго сьлядох ідуць Пэтрарка, Боккачыо і іншыя; не пакідаючы мовы лацінскай, яны шырока карыстаюцца жывой народнай гутаркай. Падобна ім і Францішак Скарына ў сваім перакладзе сынтэзуе элемэнты мёртвае царкоўна-славянскае мовы і жывое беларускае гутаркі. У нашага дзеяча мы знаходзім выразы нацыянальнае сьвядомасьці“ **).

І так, Скарына — гэта прадвесьнік беларускага сучаснага адраджэньня, гэта лучнік беларускай мінуўшчыны з сучасным беларускім нацыянальным жыцьцём.

Словам, Фр. Скарына, як вялікі культурнік, даў Беларускаму народу ўсё, што мог, а мог дужа многа, бо паклаў асновы і зрубы пад народны беларускі дом, будаваньне якога сяньня Беларускі народ, паводле ўзораў свайго вялікага сына, і вядзець далей.

*) Яз. Воўк-Левановіч — там-жа, бач. 264.
**) М. Піотуховіч — Фр. Скарына (400-лецьце, 178—179).

Др. Ст. ГРЫНКЕВІЧ

Псыхоаналіза і праблемы — літаратурныя і грамадзкія

Псыхоаналіза зьяўляецца сяньня асобным дзеля самое сябе сьветам, як кажа адзін з аўтараў. Ды сапраўды, няма ніводнае з галінаў праяваў псыхічнага жыцьця, якая-б ня мела большага ці меншага кантакту з навукаю Фрэуда. Замінаю найбольшаю дзеля прыйма ці прадстаўленьня псыхоаналітычнае тэорыі ня будзе аднак вялікі абойм яе, а нашыя да яе адносіны. Навука Фрэуда, калі і спыніцца толькі на адной старане ейнай, а мяноўна на *мэтодзе досьледаў,* дык і тутка яна адрозьніваецца ад кожнае іншае тэорыі ці мэтоды, што закранае ў нас асаблівыя староны асабовасьці. Выклікае яна ў нас цэлы камплекс настрояў пачуцьцёвых, дзякуючы чаму прападае ў нас аб'ектыўны падыход да зьявішчаў і сытуацыяў. Пачынаем ацэніваць факты абстрактныя, аб'ектыўныя, з гледзішча моралі, рэлігіі, якасьці грамадзкае і г. д. У першую-ж чаргу тэорыя псыхоаналітычная закранае ў нас той вельмі зложаны сьцяг працэсаў, які абхопліваем аканчальна паймом жыцьця *сэксуальнага.* Дык дзеля таго гаварыць аб псыхоаналізе, нат' з гледзішча навуковага, гэта нешта іншае, як прыкладам гутарка аб тэорыі пазнаньня ці зноў аб вельмі заблытанай тэорыі аканамічнай.

Я вельмі добра гэта ўсенька разумею і дзеля гэтага прымаю загадзя шматлікія закіды, якія могуць мяне сустрэнуць са стараны чытача, калі ніжэй буду гаварыць аб некаторых старонах псыхоаналізы.

Навука Фрэуда гэта сяньня сыстэма, сыстэма суцэльная, якая базуецца ў першую чаргу на гэніяльным уяўленьні, сапраўднасьць каторага пацьвярджала і пацьвярджае далей жыцьцё ў сфэры паталёгіі адзінкі і грамады, найбольш ярка ў *нэурозах,* а далей амаль што не ва ўсіх галінах праяваў псыхічнага жыцьця агулам.

Маючы наўвеце прадставіць адносіны і ўплыў псыхоаналізы на літаратуру і на зьявішча грамадзкага жыцьця, немагчыма абмінуць, прынамся ў кароткім нарысе, гістарычнага разьвіцьця навукі Фрэуда і тых ейных найважнейшых асноваў, якія сяньня зьяўляюцца магутнаю здабычаю думкі чалавецкае. Інакш можна было-б баяцца, што апынімся бяз фундаманту, на якім, як заўсёды, стаіць кожная будыніна.

Псыхоаналіза, інакш як кажуць *навука Фрэуда,* або яшчэ прасьцей — *фрэудызм,* злучана вельмі стульна з асобаю тварца, з Фрэудам як чалавекам, з ягонаю расаю, паходжаньнем, грамадзкім становішчам і г. д. Паказываюць, як пачынальнікаў псыхоаналізы Нітшага, Шопэнгаўэра, Гэрбарта, аднак ня зусім правільна. І назоў псыхоаналізы нікаторыя хацелі-б спалучыць з прозьвішчам Жанэта, францускага псыхолёга, і Юнга. Юнг аднак быў хутчэй вучнем Фрэуда, а калі з Жанэтам мае Фрэуд некаторыя мамэнты супольныя, дык усёж-такі псыхоаналізу, як мэтоду лекаваньня а далей як асобны род псыхолёгіі ці нат філёзофіі жыцьця, дала школа Фрэуда.

Асяродзішча жыдоўскае Фрэуда, у якім ён радзіўся, вельмі характэрнае дзеля разьвіцьця падзеяў ягонае навукі. Ад самае раньняе моладасьці, будучы жыдом, бачыў ён сваю нейкую апрычонасьць, тую іншасьць, аб якой калі ў заходняй Эўропе і не гаворыцца, дык аднак якую ўсе ня гледзячы на ўсенька вельмі добра чуюць. Гэныя вось расавыя свомасьці, побач магчыма са свомасьцямі свайго характару, далі маладому Фрэудаві тую *незалежнасьць унутраную* на пагляды, настроі, валадаючыя грамадзянствамі ці навуковымі тэорыямі. Ад вельмі раньніх гадоў цікавіцца псыхолёгіяю. Будучы маладым лекарам знаёміцца ў Францыі з найбольш тады моднымі і шырока вядомымі вогнішчамі досьледаў псыхолёгічных у клініках Шаркота і Бэрнгэйма. Вярнуўшыся ў Вену наладжывае блізка супрацоўніцтва з Брэўэрам, адным з лекараў-нэўролёгаў. З гэным Брэўэрам даглядалі супольна за адною хвораю, папулярнаю ў літаратуры ў сувязі з тым, што якга гэная хворая пачала ў пэўным сэнсе эру прыхоаналізы.

Хворая мела праявы нэўрозы, вядомае пад назоваю гістэрыі. Не магла яна між іншым хадзіць, зусім абнядужаная ляжала ў ложку, не магла нічога есьці, хаця ўсе органы цела былі быццам здаровыя, значыцца нармальнае абсьледаваньне цела не магло паказаць на тое, каб нейкі з органаў быў пашкоджаны ў сваёй дзейнасьці. Вось Фрэуд з Брэўэрам спрактыкавалі на хворай новы спосаб лекаваньня, а мяноўна выклікалі ў яе гыпнозу і ў сьне гыпнотычным давалі магчымасьць *рэагаваць* на ўспаміны, калі асабліва ўспаміны былі афарбованыя пачуцьцёва ад'емна. І цікава, што шмат якія з праяваў хворасьці пасьля такое неабмяжованае нічым рэакцыі прападалі бяз сьледу, а знача хворая здаравела, прападала абнядужаньне, заміны пры глытаньні і г. д.

На асноведзі ўжо гэнае аднае хворае паявілася новае разуменьне нэурозаў у Фрэуда. Кожнае неадрэгаваньне зьявішча, якое было нямілым з тых ці іншых прычынаў, не прападае бязсьледна, а толькі хаваецца для нашае *сьведамасьці,* загнанае ў нясьведамасьць ці падсьведамасьць, залежна ад сілы ад'емнага афэкту, выкліканага ў дадзенага чалавека. І вось гэныя *выціснутыя* ў „падпольле“ перажываньні не сядзяць спакойна ў нясьведамасьці, а стараюцца прашмыгнуць у актуальную, значыцца сьведамую, плошчу працэсаў псыхічных пад нейкаю іншаю формаю. Дзеля гэтага яны будуць часта зусім незразумелыя.

Жыцьцё поўніцца такімі прыкладамі. Кожны з нас могбы часта бачыць на сабе гэткае зьявішча. Дзеля ілюстрацыі дам такое здарэньне.

Малады чалавек ідзе ў манастыр. Рупіцца ён аб сваю душу, спадзяецца ў духоўным стане знайсьці магчымасьць працаваць для свайго народу. У манастыры бачыць ён ад першых дзён вялікае разыходжаньне паміж ідэалам, аб якім лятуцеў так доўга, а сапраўднасьцю. Замест справаў боскіх, сустрэнуў ён штодзенных людзей, занятых, як усюды, штодзеннымі патрэбамі, клапотамі. Да таго разыходжаньне паміж мараьлю афіцыяльнаю а сапраднасьцю. Хацеў-бы пратэставаць, крычаць, што ўсё гэта ня так, як ён сабе ўяўляў, ня тое, чаго ён спадзяваўся. Пратэст мог-бы ён выказаць між іншым такім спосабам, што пакінуў-бы манастыр і вярнуўся-б да жыцьця нармальнага. Ня так зноў гэта лёгка зьдзейсьніць. Што скажуць на гэта маці, сваякі, знаёмыя, — падумаюць, што ён уцёк дзеля нейкіх мяркаваньняў няпрыгожых! Да таго-ж ён сапраўды хоча астацца манахам, бачыць тутака свой поклік жыцьцёвы. Не дапускае дзеля гэтага да свае сьведамасьці на'т і думкі аб выхадзе з манастыра.

Доўга ня ждучы, наглядаем у гэнага чалавека нейкія незразумелыя праявы, якія аканчальна даводзяць маладога манаха да лекара. Калі апыніцца ён толькі ў царкве, значыцца на месцы, дзе сьвядома хоча працаваць і дзе маніцца паводле сваіх плянаў і мяркаваньняў спагнаць усё жыцьцё, дык вось на тым месцы пачынае ў яго моцна біцца сэрца, круціцца ў галаве і кожны раз трэба яму пакінуць сьвятыню. За парогам сьвятыні ён зноў здаровы чалавек.

Сытуацыя такая вельмі цяжкая псыхічна і на пагляд незразумелая. Сам хворы не разумее нічога, што з ім робіцца. Ведаючы ўсё тое, аб чым было гаворана вышэй, ды помнячы аб існаваньні н я с ь в е д а м а с ь ц і з яе праявамі і незалежным ладам, лёгка можам усё сабе паясьніць. Чалавек гэны дзякуючы сваёй хваробе зьдзейсьняе тое, чаго зрабіць ня мог, зьвязаны сваімі плянамі жыцьцёвымі, мяркаваньнямі нацыянальнымі, сямейнымі і г. д. Кандыдат у манахі, разачараваўшыся ў сваім покліку, рэалізуе ў сваёй хваробе тое, чаго ня мог зрабіць сьведама. Ягоная ж хвароба робіць абсалютна немагчымым далей аставацца ў манастыры!..

Крыху даўжэй я спыніўся над прыкладам дзеля ягонае прасьціні і адначасна паўніні мэханізмаў вельмі характэрных дзеля зразуменьня псыхоаналізы. Бачым на ім, як ня трэба лепш, аснаўны факт у псыхоаналізе, а мяноўна прысутнасьць у нас *нясьведамасьці* і амаль што непераможны ейны *ўплыў* на ўсё жыцьцё. Бязумоўна, шмат якіх са здабычаў Фрэуда сяньня ня выклікаюць у нікога сумліваў, дык і пацьвярджэньне існаваньня ў нас нясьведамасьці ня толькі нас ня дзівіць, а гэта нешта зусім дзеля ўсіх зразумелае. Сорак гадоў таму назад гэта была рэвэляцыя і не малая рэвалюцыя ў псыхолёгіі.

Фрэуд паставіў пытаньне, чаму гэта шмат якіх перажываньняў вельмі цяжка прыпомніць. Паясьняе ён, як лёгка з вышэйпададзенага прыкладу зразумець, што прыпомніць цяжка тыя факты, якія дзеля тых ці іншых прычынаў маюць нямілую дзеля нас ахварбоўку. Найчасьцей гэныя перажываньні далёкія і хаваюцца ў *дзіцячых* гадох. Хаця мо' крыху і дзіўна чуючы такі сказ, аднак гэта факт.

Новым этапам у разбудове тэорыі псыхоаналітычнае была спасьцярога, што большасьць выціснутых у нясьведамасьць перажываньняў мае характар *сэксуальны.* Зразумела, што такая пастаноўка справы выклікала вельмі гарачы пратэст, у першую чаргу, у сфэрах лекарскіх, з якімі Фрэуд падзяліўся сваімі спасьцярогамі. Як сам Фрэуд расказывае ў сваіх успамінах пасьля першае лекцыі на гэную тэму пачуў ён амаль што не ў даслоўным сэнсе, як паміж ім і слухачамі вырасла пропасьць, усе адхінуліся ад яго, ніхто не хацеў з ім гаварыць, ніхто аб нішто ня пытаў. Глядзелі ўсе на яго быццам на каналію...

Трэба сказаць, што такія адносіны да псыхоаналізы можам сустрэнуць часта і сяньня. Фрэуд аднак ведаў такую атмосфэру ўжо раней, калі чалавек пакрыўджаны несправядліва абсьмейваецца сваімі ворагамі, — дык цяпер ён не паддаўся прыгнечанасьці. Бадзёра працуе далей. Пакрысе знаходзіць прыхільнікаў. Далучаюцца да яго людзі старэйшыя, людзі з вялікаю практыкаю жыцьцёваю і ведаю клінічнаю, якім новае насьвятленьне зьявішчаў у псыхіцы чалавека рабіла зразумелымі шматлікія праявы ў галіне хворасьці. Далучаюцца да яго швайцарскія псыхіятры Б л е ў л е р і Юнг. Вучні ягоныя наладжываюць саюз, выдавецтва псыхоаналітычнае, якое мае наўвеце распаўсюджываньне здабычаў новае навукі. У далейшых гадах наглядаем паміж вучнямі разыходжаньні, разломы (Адлер, Юнг), аднак тэорыя з Вены разыходзіцца па сьвеце і псыхоаналіза мае спагаднікаў на міжнародным грунце на некалькі ўжо гадоў перад вайною. З пачатнае мэтоды лекаваньня вырастае навука, абхопліваючая ўсе праявы культурнага жыцьця. Трэба сказаць, што нат' сымпатыкі і прыхільнікі фрэудызму бачаць заняпад навукі Фрэуда ў апошніх некалькінаццаці гадах ягонае дзейнасьці. Кажуць, што сыстэма заялавела, зрабілася вельмі аўторытатыўнаю, што з тэорыі навуковае вырасла нешта быццам сэкта рэлігійная і г. д. Не ўваходзячы бліжэй у ацэнку апошніх мамэнтаў, трэба сказаць, што бязумоўна цэлы сьцяг фактаў падчыркнутых Фрэудам зьяўляецца асаўною здабычаю сучаснае культуры.

Жыцьцё ў насьвятленьні псыхоаналізы мае асаблівы зьмест. Жыцьцё будзе ігрою *імпульсаў* і ў першую чаргу імпульсаў сэксуальных. Імпульсы гэныя паводле Фрэуда маюць дзеці ўжо ад найменшых гадоў свайго жыцьця. Першы пэрыяд гэных імпульсаў праяўляецца ў *аўтоэротызьме,* хутка аднак яны пераходзяць на людзей з найбліжэйшага асяродзішча, значыцца на бацькоў, і выклікаюць даволі хутка *камплекс Эдыпа.* Паймо камплексу

Эдыпа вельмі важнае дзеля далейшага разьвіцьця тэорыі псыхоаналітычнае і зьяўляецца свомасьцю дзеля яе вельмі характэрнаю. Прыняць за аснаўны закон існаваньне камплексу Эдыпа на нармальным шляху разьвіцьця адзінкі было вялізарнаю рэвалюцыяю ў тагочасным ды на'т і сяньняшнім нашым сьветапаглядзе. Нешта, што было даўней ненармальным, праява хворасьці, сяньня пачынае быць неабходным этапам. Камплекс Эдыпа азначае ня больш ня менш, як сэксуальныя спробы (хутчэй у сымбалічным чымся даслоўным сэнсе слова) ў адносінах да бацькоў, у сына да роднае маткі, у дачкі да бацькі. У пару дасьпяваньня частковыя імпульсы сэксуальныя накіроўваюцца на падтрыманьне роду. Вельмі важны пераход з пары поліморфічна-пэрвэрсыйнага сэксуалізму да імпульсаў частковых сэксуальных (інакш можна казаць да нармальнага плоцьнага жыцьця дарослага чалавека). Калі пераход гэны насустрэне на сваім шляху нейкія заміны, у далейшым жыцьці праявяцца яны ў шматлікіх н э у р о з а х ці на'т хваробах псыхічных. Першая пара жыцьця сэксуальнага (ў дзіцячых гадох) не пакідае быццам па сабе ніякіх сьледамкаў, так што ня можам аніяк уявіць іх пазьней. Супакой гэны толькі спадумны аднак, а паказальнікам таго і будуць праявы хваробаў рознаякіх, з якімі часта сустракаецца лекар.

Ці сапраўды жыцьцё — гэта выключна ігра сэксуальнага інстынкту? Фрэуд не пярэчыць прысутнасьці і вялікага значэньня іншых імпульсаў. Процілежным да імпульсу сэксуальнага ў чалавека будзе тое, што Фрэуд называе *Ichtriebe*. Калі імпульсы сэксуальныя былі імкненьнем да *роскашы*, гэнага аснаўнога мотару жыцьцёвага, дык у процілежнасьць да гэтага прынцыпу роскашы жыцьцё накідае сапраўднасьць з ейнымі вымогамі. Бязумоўна, што і ў Ichtriebe імкнемся да роскашы, толькі тае іншае, пабудаванае на досьледзе, што не заўсёды найкарацейшая дарога найлепшая, што вельмі часта трэба зрачыся, прынамся часова, з прынцыпу роскашы, каб дастаць эквівалент мо на'т большы ў будучыне.

Як была ўжо гутарка, аснаўным мамэнтам дла Фрэуда будзе той націск, які ён робіць на значэньне нясьведамых працэсаў псыхічных. Імкненьне да роскашы незаўсёды будзе згоднае з вымогамі моралі, апініі грамадзкае, узгадаваньнем, традыцыямі. Імкненьні нязгодныя з тымі ці іншымі вымогамі сустракаюць цэнзуру, якая не дапускае іх да сьведамасьці, выціскае іх, выпірае. Фрэуд вельмі абразна паказывае на розьніцу паміж сьведамасьцю і нясьведамасьцю. Сьведамасьць — гэта быццам салён, а нясьведамасьць — уваход да будыніны нашае душы. Паміж уваходам і салёнам, на нейкім быццам карыдоры паміж імі, сядзіць сторож (цэнзура), які не дапускае ўсяго, што будзе нязгоднае з традыцыямі ці абычаямі салёну. Няпрошанае імкненьне, як той назойлівы госьць, хоча пралезьці ў салён пераменіўшы вонкавы выгляд. Калі і ня здолее пралезьці, дык усётакі наробіць гоману ў карыдоры і выкліча непарадак, не даючы спакойна жыць. Той гоман, непарадак практычна праяўляецца ў жыцьці ў розных нэурозах, хваробах. Усе мы аб'ектамі памянёных падзеяў. Ня ўсе мы хварэем, прынамся ня ўсе мы бачым у сябе хворасьць. Жыцьцё само праводзіць ліквідацыю цяжкіх сытуацыяў. Даволі бывае шчырае гутаркі з сымпатычным нам чалавекам, каб канфлікт ня лішне цяжкі быў зьліквідаваны. Споведзь шырока практыкаваная ў каталіцкім касьцеле — адзін з доказаў, як лёгка можна зьліквідаваць даволі цяжкія канфлікты дзякуючы аднэй шчырай гутарцы з духоўнікам, да якога ідзём з даверрам.

На гэтым спыніўся я ў абгаворываньні тэорыі псыхоанализы. Нажаль не магу абгаварыць шырэй дзеля нястачы месца цэлага сьцягу мэханізмаў, якія лягчэй памагаюць зразумець навуку Фрэуда. Між іншым нічога я не казаў аб псыхопаталогіі штодзеннага жыцьця, аб тэорыі сну і г. д. Агульна трэба сказаць, што няма нічога ў жыцьці, што ня мела-б свайго с э н с у. Кожная памылка, кожная падзея, кожны на'т сон, на які мы прывыклі заглядацца быццам на нейкую брэднюшку, усё гэта мае свой сэнс, сваю прычыну.

Ясна, што зьявішчы літаратурныя, праблемы ўзгадаваньня, праблемы рэлігійныя, праблемы моралі, агулам цэласьць працэсаў грамадзкага жыцьця паясьняецца псыхоаналізаю часта зусім інакш, чымся мы да гэтага прывыклі ў нашым жыцьці. Як ужо некалькі разоў я казаў, прынцыповае значэньне мае тутака камплекс Эдыпа, ці лепш казаць той спосаб, якім камплекс гэны быў зьліквідаваны. З гэнага камплексу вырастае, можна сказаць, уся нашая культура на шляху сублімацыі, перамены і абмену прымітыўных імпульсаў сэксуальных. Абнова гэная рэалізуецца ў нас нясьведама.

Вартасьць літаратуры, падыходзячы да яе найбольш глыбока, хаваецца ў тым, што аўтар у сувязі з канкрэтным прыкладам ці шматлікімі прыкладамі, пасьля аналізы прыведзеных фактаў дае нейкае абагульненьне. У сувязі з такім паймом літаратуры стульна злучана праца, творчы працэс. Пераказываньне толькі фактаў з вельмі цікаваю на'т фабулаю яшчэ ня будзе літаратураю, будзе гэта хроніка, можа быць адчасьці гісторыя. Бязумоўна, я ня думаю тутака зузім аб ніякай канкрэтнай форме літаратуры. Форма ня мае пры нашым падыходзе да літаратуры нейкага асаблівага значэньня. Пры такім падыходзе да пісьменства трэба сказаць, што сапраўднаю літаратураю ня будзе літаратура факту, нараджэньне якое мы наглядалі пасьля вайны, а сяньня бачым, можна сказаць, поўны яе заняпад. Прыклад канкрэтны гэнае кароткае гісторыі літаратуры факту бачым у пісьменстве савецкім.

Літаратура належыць да праяваў інтэлекту. Аднак межы, якія яна абхоплівае, шмат шырэйшыя, чымся сам інтэлект. У гэным творчым працэсе, як у кожным іншым, трэба зачапіць аб старану, якая ў першую чаргу рашае аб вартасьці і характары

адзінкі, значыцца сфэру пачуцьцёвую. Мусіць яна закрануць інстынкты, мусіць абхапіць нясьведамасьць. Бязумоўна, што літаратура спаўняла гэныя задачы шмат раней, чымся Фрэуд апрацаваў свае тэзы, чымся укупіў у законы факты, абгаворываныя і паясьняныя ў літаратуры.

Калі мы гаворым аб суадносінах паміж псыхоаналізаю і літаратураю, дык ца гэтае тэмы можна падыходзіць з *дзьвёх* старон. Маглі-б мы прадусім прабаваць паясьніць літаратурныя зьявішчы з *гледзішча* псыхоаналітычнага а далей спыніцца над *уплывам* фрэудызму на актуальную творчасьць у літаратуры. Мы спынімся толькі над першаю з памянёных старон.

Нельга не прамаўчаць таго, колькі месца ў літаратуры займае *каханьне.* Доўга раман быў амаль што не адзінаю прызнанаю формаю творства літаратурнага. Кажу аб той пары культуры чалавецкае, калі пісьменства пачынае іграць незалежную ролю ў „сьвецкім“ грамадзянстве. Праблемы каханьня амаль што ня ў 100 проц. бачым у паэзіі і творстве народным. Ціж ня будзе тутака поўнае згоды з Фрэудам, калі той нам кажа, што найважнейшым мотарам жыцьцёвым будуць інстынкты, і то якга інстынкты сэксуальныя?!

Калі ў пару дасьпяваньня наглядаем амаль што не агульны поклік да званьня паэты, дык зноў дзеля таго, што дзякуючы паэтычнай форме можам выказаць усё недасказанае і схаванае ў нясьведамасьці. Творства паэтыцкае, як бліжэй здаецца і немагчыма, працуе аднолькаваю мэтодаю з псыхоаналізаю (ня будзем спрачацца, калі нехта скажа наадварот, што псыхоаналіза карыстаецца мэтодаю паэтыцкаю). Гэткае разуменьне мае сваю вартасьць агулам для паэзіі. У пару дасьпяваньня некаторыя мамэнты псыхолёгічныя творства бачым у больш яркім насьвятленьні. Пара дасьпяваньня мае столькі сумляваньняў, загадак, канфліктаў, а што яшчэ горш, канфліктаў няўяўленых, недагавораных. У сьведамасьці ня бачым прычын, цяжка паясьніць тыя сытуацыі, якія выклікаюць няясныя, унутраныя зрухі, тугу па нечым, да нечага. І вось у творстве адкідаем спадумнага гаспадара адзінкі — інтэлект — і кідаемся на хвалі фантазіі. Карысьць суб'ектыўная з такое паэзіі бязсумліўная. Вартасьць больш шырокая, агульная будзе большая ці меншая, залежна ад таго, што прадстаўляе з сябе гэтая адзінка, акі ейны талент і г. д. Часта ніколі ня вернецца да пяра. Бываюць іншыя, больш шчасьлівыя, ці мо' зусім наадварот, якія назаўсёды астануцца ў палоне пяра і пры кожнай нагодзе канфлікту ці патрэбы сказаць нешта шчыра, гарача, ад сэрца, могуць толькі ў паэтыцкай форме выказаць усё, што накіпела і набалела ў душы. Дык гэнае творства зьяўляецца патрэбаю ўнутранаю, гэта будзе да пэўнае меры акт самалячэньня.

Ці хачу гэтым сказаць, што сапраўдныя паэты людзі хворыя? І так і не. Што гэта патрэба натуральная — паказвае найлепш народная паэзія, дзе няма іншых імпульсаў да творства,

як толькі імкненьне да ліквідацыі ўнутраных канфліктаў. Ясна, што ўмовы шырэйшага грамадзкага жыцьця выклікаюць новыя аспэкты ў творстве, робяць да пэўнае меры адумыслоўцаў з паэтаў. Калі аднак гутарка аб сутнасьці справы, дык прадстаўляецца яна так, як я кажу.

Усё, што было гаворана аб паэзіі, цалком тарнуецца да іншых формаў літаратуры. Усюды бачым імпровізацыю, калі зьяўляецца пытаньне дакапацца да глыбейшых слаёў душы. Імпровізацыя і будзе актам, у якім найбольш патайныя думкі паказываюцца ў гатовай ужо форме, быццам неспадзеўкі. І форма і зьмест часта вельмі далёкія ад вартасьці чалавека - тварца, якога мы ведаем на штодзень. У імпровізацыі чалавек прадстаўляецца нам няпоўны, няма тутака інтэлекту, прынамся таго інтэлекту, што да ўсяго крытычна прыглядаецца. Незалежна ад гэнае аднабокасьці такога акту, імпровізацыя мае значэньне ня толькі суб'ектыўнае для адзінкі. Гэная апошняя ў такіх нагодах у спосаб, хаця яно на здаровы розум можа і незразумела, будзе ўцелаішчэньнем дадзенае групы, грамады, народу. У такіх імправізаваных актах зьмест пачатна бывае незразумелы, ня бачым у ім лёгікі і толькі далейшае жыцьцё паказывае, што сапраўды тварэц быў *вяшчуном.* Паэзія і творства кожнага народу дае ў розных галінах прыкладаў бяз ліку. Нашая беларуская літаратура ня розьніцца ад іншых. Дык мерыць тварца ня можна ягонаю вопраткаю, формамі хатняга жыцьця, на'т стойкасьцю ягоных паглядаў нацыянальных ці іншых. Вартасьць ягоных імпровізацыяў ляжыць зусім у іншых плошчах!..

Аб гэтым усім ведама было і да эры Фрэуда. Дзякуючы аднак яму, мы навучыліся разумець і ацэніваць, чаму імпровізацыі маюць гэткае значэньне грамадзкае і індывідуальнае. Тутака, як ня трэба лепш, наглядаем, што якга пры ацэне кожнага зьявішча найтрудней бывае знайсьці цэнтральны пункт, а знайшоўшы яго — усё ўжо робіцца ясным.

Людзі бачылі, як кажу, даўно, што сам інтэлект, які ўсеўладна валадае быццам намі, не вырашае ўсяго, не паясьняе нам усіх тайніцаў і зьявішчаў на'т і штодзенных. Бачым аднак ужо ў даваеенай повесьці (Буржэт) пагляды даволі блізкія, да якіх і мы даходзім. Апошні аўтар даслоўна гаворыць: „душа нашая — гэта быццам зямля або цэлы сьцяг востраваў, вярхі якіх вока бачыць над вадою. Вярхі гэныя гавораць аб існаваньні таго фундаманту, з якога вярхі вырастаюць. Фундаманты тыя толькі могуць паясьніць характар скалаў, што паказываюцца над вадою. Усе нашыя клопаты, нашыя сумляваньні вырастаюць з фундаманту псыхічнага, які аднак зусім незразумелы ані нам ані нашым блізкім“. У гэтым сказе бачым прыймо становішча Фрэуда аб існаваньні нясьведамасьці і магутнай ролі гэнае часьці нашае душы ўва ўсім жыцьці. Прыглядаючыся бліжэй да падзеяў роду чалавецкага, убачым усюды, як тэза нясьведамасьці і ўсіх консэквэнцый, выплываючых з гэткага становішча,

уецца чырвонаю істужкаю. Інакш ня можна разумець дабра і зла, праблемы аснаўное кожнае з рэлігіяў. „Зло" і будзе прызнаньнем у плошчы рэлігіі факту існаваньня нясьведамасьці. „Мы ахвяры — кажа Гэйсманс — тых помірсных думак і нахілаў, якія дрэмлюць у кожным, на'т найлепшым з нас. Яны (гэныя думкі) крыніцаю таго, што найлепшы сын лятуціць, не ўяўляючы нічога благога, аб сьмерці бацькоў". Дзеля паясьненьня дадам толькі, што гэны калісь вельмі популярны аўтар ня быў ані камуністым ані анархістым, а шырока вядомым канвэртытам каталіцкім. Буржэт-жа зноў—гэта прадстаўнік кансэрватыўнае з нахілам рэлігійным групы францускага грамадзянства.

Артыст нездаволены з сапраўднасьці, адчувае ў сабе ўнутраны непакой, шукае палёгкі ў іншай плошчы. Ён, паводле Фрэуда, адварочываецца ад рэчаіснасьці, сусярэджывае свае зацікаўленьні на libido, на лятуценьнях. Гэны адхіл ад сапраўднасьці, гэны аўтызм, як кажуць псыхіятры, можа давясьці да хваробы. Прысутнасьць аднак таленту дае пэрлы літаратурныя, як і агулам мастацкія. Толькі ў насьвятленьні псыхааналітычнае тэорыі можам уявіць творства ў ягоных асновах і адначасна розныя праявы творства розных народаў, расаў. Разумеем, чаму Дантэ і Боккачыо тварылі над цёплым паўдзённым небам, чаму нашая паэзія нашаніўская была іншаю, чымся паэзія пролетарская сучасных савецкіх пісьменьнікаў, ці на'т і нашых тутака маладых паэтаў. Розная асноведзь жыцьця імпульсыўнага дае нам адказ паясьняючы ў сумлівах з плошчы літаратурнае.

Фрэудызм заўсёды стаяў блізка практыкі жыцьцёвае. Не прайшоў ён моўчкі і над праблемамі *грамадзкімі*. Формы жыцьця грамадзкага, разьвіцьцё гэных формаў мо лепш, як пры ўсіх іншых паясьненьнях, робяцца зразумелымі ў Фрэуда. Існуе вельмі блізкая аналёгія паміж суадносінамі сяброў і розных грамадаў у грамадзянствах з найдаўнейшых эпохаў, а тым, што бачым у снах, у хворых псыхічна і ў дзяцей. І хаця сказ гэны гучыць быццам фалшыва для вуха—практыка жыцьцёвая, досьледы над аналізаю сонных мрыяў, практыка са штодзеннага нагляданьня за хворымі і дзяцьмі дае нам магчымасьць уявіць тыя шляхі, прынамся ў аснаўных нарысах, якімі йшло чалавецтва ў сваіх дасюлешніх падзеях.

Дзеля ілюстрацыі пакажу хаця-б на такі мамэнт, як адмова ад прынцыпу роскашы і ўмеласьць адмовіцца ад роскашы мамэнтальнае на карысьць тае-ж роскашы собскае, толькі зьдзейсьненае ў пазьнейшую пару, адным словам тое, што завецца ў Фрэуда змаганьнем паміж *Lustprinzip* і *Realitätsprinzip*. Колькі трагэдыяў, колькі няшчасьцяў можам наглядаць якга ў гэную пару, найчасьцей у пару дасьпяваньня псыхічнага і фізычнага адзінак! Вузкія, эгоістычныя адносіны маладое адзінкі да ясяродзішча, ня гледзячы на спадумны ідэалізм гэнае пары ў жыцьці даводзяць да пратэстаў, рэвалюцыяў, вострых канфліктаў у адносінах да бацькоў, хаты, сяброў, грамадзянства. Яшчэ больш трагічна прадстаўляецца

гэнае разьвязаньне ўзаемаадносінаў абодвых прынцыпаў у плошчы сужыцьця грамадаў, пляменьняў, народаў. Сяньняшняя заблытанасьць палітычных адносінаў у міжнародным маштабе, права „малых" і „вялікіх", як ня трэ лепш паказвае, як вельмі цяжка знайсьці тую залатую сярэдзіну, дзе добра было-б і мне і майму суседу.

Камплекс Эдыпа, які ў культурных грамадзянствах лёгка лікві̇дуецца і пры належных умовах робіцца магутным жаралом потэнцыяльных магчымасьцяў адзінкі, гэны кamплекс у больш прымітыўных формах суадносінаў быў прычынаю забойстваў, сьмерці бацькоў, старшых родаў, начальнікаў пляменьняў. Гэны-ж камплекс на'т на вышэйшым роўні разьвіцьця праходзячы цераз пэрыяд Totem і Tabu грамадзянстваў прымітыўных будзе крыніцаю нашае моралі, этыкі.

Псыхааналіза ня толькі ў адносінах да гісторыі цывілізацыі паясьняе пяройдзеныя ўжо шляхі. Можам у ёй знайсьці паясьненьні адносна падзеяў гістарычных, ці нат тых, якія наглядаем сваімі собскімі вачыма. У насьвятленьні псыхааналізы штораз меншая колькасьць таёмных загадак, зьявішчаў, непавязаных у адну цэласьць. Бязумоўна, што падзеі чалавецкія не прызнаюць ніякіх пераскокаў. Усё тутака аднолькава з жыцьцём паасобнае адзінкі ляжыць у рамах лёгікі. Магчыма, што мы толькі ў дадзены мамэнт ня бачым законаў гэнае лёгікі. У гэнай плошчы ўплыў продкаў дзеіць на нас, быццам сьвятло тых зорак, якія даўно ўжо пагасьлі, хаця сьвятло іх і сяньня мы бачым. Чым паясьняецца факт, што бачу лепшае а раблю горшае (video meliora, deteriora sequor). Дзе прычына, што павадыры грамадзянстваў паказываюць на мэты прыгожыя, адначасна паказываючы і на шляхі, якія да іх вядуць, з другое стараны і некаторыя слаі грамадзянства выказываюць шчырую ахвоту да зьдзейсьненьня паказаных мэтаў, а ня гледзячы на гэныя ўсе ўмовы самое зьдзейсьненьне астаецца пустым гукам?!

І толькі помнячы, што ў абедзьвюх сытуацыях побач з мэтамі сьвядомымі рэалізуем адначасна і тыя, над якімі няма ніякае кантролі, якіх нат прысутнасьці не падазраваем, дзеля таго, што разыгрываецца ўсё змаганьне ў плошчы нясьведамасьці, лёгка зразумеем разыходжаньні паміж ідэалам і сапраўднасьцю. Часта рэалізуем ня тое, што хочам, а тое, што можна, ці йнакш кажучы тое, на што пазволіла цэнзура.

У гэтым бачым аграмаднае значэньне ролі інстынктаў, калі інстынктам назавём свомасьць выконываньня мэтных актаў без таго, каб мы бачылі самую мэту ды адначасна бяз ніякага напрактыкаваньня ў выконываньні. Разважаючы вышэй сказанае, прыйдзём да вываду, што *інстынкт* — гэта аснаўная пружына поступу. Розум — гэта толькі завяршэньне, найвышэйшы пункт працы сьвядомае над сабою адзінкі. Інтэлект сам астанецца сухім і бяздзейным, калі ня меціме падтрыманьня ў інстынктах.

Гэткім чынам мы дайшлі да вельмі важнае, магчыма найважнейшае стараны практычнае псыхааналітычнага падыходу

да жыцьця. Маю наўвеце *ўзгадаваньне* маладога пакаленьня. Сяньня валадае прынцып, да якога мо лішне позна прыйшлі ўзгадаваўцы, што ня толькі трэба вучыць, а трэба ўзгадоўваць характар чалавека. У імкненьні да ўзгадаваньня нельга абмінуць інстынктаў. Хочучы дзеяць на інстынкты, трэба іх добра ведаць. Трэба адкінуць той вялізарны баляст ілжы, што ляжыць на кожным з нас, калі хочам закрануць самастойна якую колечы з галінаў жыцьця. Афіцыяльная мораль прымушае нас да пашаны кожнага аўтарытэту, незалежна, ці аўтарытэт гэны абаснаваны ці не. А такая мораль, як слушна кажа францускі псыхолёг Марі, хаця зьяўляецца вялікім волатам, аднак гэны волат вельмі небясьпечны,—дзякуючы гэткай моралі мы сьведкамі трагэдыяў грамадзкіх ды індывідуальных.

П. КАНТРЫБА

Новае з гісторыі беларускай мовы ў XIX стаг. ў Каталіцкім Касьцеле

Нядаўна вышаў у сьвет грубы том кніжкі біскупа-суфрагана Сандомерскага, Паўла Кубіцкага, пад назовам: „Bojownicy kapłani za sprawę kościoła i Ojczyzny w latach 1861—1915 (cz. 2, t. I).

Кніжка гэная абгаварвае падзеі прасьледу Касьцёла „na dawnej (?!) Litwie i Białorusi“, апіраючыся на ўрадавых дакумэнтах расейскіх уладаў, кансісторскіх архіваў, манастырскіх і прыватных асоб. Напачатку аўтар дае прадмову і паказвае крыніцы і працы, а так-жа спыняючыя свабоду Касьцёля распараджэньні расейскага ўраду. Што датыча гістарычнай навуковай мэтоды, дык праца біскупа Кубіцкага далёкая ад дасканальнасьці, затое мае яна не малую вартасьць, як проба адшуканьня і сабраньня дужа расьцярушаных матар'ялаў у вадну цэласьць, якая аблягчыць досьледы далейшыя.

Сусім ня дзівімся, што бадай усю заслугу барацьбы за справу Касьцёла аўтар, як Паляк эндэцкага псыхічнага складу, прыпісвае польскаму клеру, успамінаючы толькі „obok niego niekiedy kapłana Litwina i Żmudzina“ (Wstęp VI). Звычайная гэта ў іх рэч ня памятаць, што ксяндзы палякі ў Літве і Беларусі былі і ёсьць у вялікай большасьці *gente Lithuani* або *Alboruthent*. Але няхай сабе гэныя „bojownicy“ астаюцца і далей у польскім пантэоне: ня думаем рабіць ніякае рэвіндыкацыі. Горш тое, што біскуп Кубіцкі бяз хістаньня ўжывае гэткіх выражэньняў, як: „w kościołach naród polski (sic!) na Litwie i Białorusi“..., замест згоднага тут з праўдай: польскія абшарнікі, спольшчанае мяшчанства, а так-жа дробная шляхта і інш.

Перадусім пададзём тут крыху статыстыкі з прадваеннай Беларусі. Вось-жа віленскі губэрнатар Любімов 5. II. 1906 году за № 1498 пісаў да тагочаснага віленскага генэрал-губэрнатара Кржывіцкага аб віленскай губэрні, што „Беларусаў ёсьць тут 1,000.100 (57 проц.), з якіх — праваслаўных 350.000, каталікоў 650.000; блізу 65 проц. беларусаў належа да Каталіцкага Касьцёла, у каторым, як ведама, дадатковае набажэнства адпраўляецца папольску, а так-жа папольску гаворацца і казаньні. У гэтай мове Беларус гавора (вярней — мусіць гаварыць) свае штодзенныя пацеры, вучыцца пачаткаў веры, гавора з сваім пробаршчам, арганістым і слугой касьцельным... Рымска-каталіцкае духавенства заўсёды самым гарачым спосабам старалася аберагаць гэткае палажэньне, спыняючы найменшыя спробы замены польскай мовы мовай беларускай ня толькі ў дадатковых набажэнствах па сьвятынях, але так-жа й у адносінах з парафіянамі паза касьцёлам, падчас адведваньня парафіі, каб спраўдзіць парафіяльныя сьпіскі і ў іншых здарэньнях“ *(бач. 285—6)*.

Ці гэткі высокі працэнт Беларусаў у быўшай віленскай губэрні быў толькі выдумкай царскай бюрократыі? Не. Трэба-ж ведаць, што ўжо ў гадох 1868—9 была ўзьняўшыся аб гэтым вострая і цікавая дыскусія між віленскім генэрал-губэрнатарам Потаповым і рымска-каталіцкай духоўнай Калегіяй у Пецярбурзе. Калі гэтая Калегія зарызыкавала цьвердзіць, што быццам „каталікі парафіяне ў вітэбскай і магілёўскай губэрніях пераважна ўжываюць польскай мовы (*sic!*), а толькі маленькая частка (*sic!*) з простага народу гавора пабеларуску“ *(бач.334)*, генэрал-губэрнатар Потапов на гэта адпісаў: „Няпраўда гэтых цьверджаньняў ёсьць яснай, бо напэўна ведама, што значная большасьць сталага насельніцтва магілёўскай і вітэбскай губ., за выняткам паветаў інфлянцкіх, гавора пабеларуску, а вышэйшыя сфэры тых-жа ваколіц, хоць не гавораць пабеларуску, але гэтую мову разумеюць“ *(там-жа)*. Ня глядзячы на тое, што ген.-губ. Потапов добрага беларускаму народу нічога не зрабіў, у прыточваных славах бліжэйшы ён да праўды, як гэная Дух. ў Пецярбурзе Калегія, што заўсёды, хоць паціху, спрыяла ідэі полёнізацыі Беларусі. Такім чынам назоў *беларускія каталіцкія парафіі* (*passim*) ёсьць даўнейшы, а не які вынаход беларускага адраджэнскага руху, што прабудзіўся на пачатку XX ст. Над анармальным рэлігійным палажэньнем гэтых беларускіх парафіяў прызадумваліся нятолькі ўлады краёвыя, але было яно так-жа прадметам студыяў у кабінэце міністра ўнутраных спраў, каторы аднак гатоў быў лішне не сьцясьняць уладаў мясцовых. Генэрал-губэрнатар Потапов бачыў практычны выхад у тым, каб у губэрскіх і паветавых местах — без параўнаньня больш спольшчаных ад вёскі — была ўжывана ў дадатковых набажэнствах бязумоўна мова расейская, а ў касьцёлах вясковых мова большасьці *(бач. 348)*. Было гэта рашэньне, калі йдзе аб месты й мястэчкі, выразна крыўдзячае, а калі йдзе аб вясковыя беларускія парафіі, чыста тэорэтычнае і дужа сумніўнай шчырасьці, а іменна справа

беларускай мовы ў дадатковым набажэнстве каталікоў ёсьць *par excellence* практычнай і вымагаючай шчырага да сябе падходу.

Вось жа нічога дзіўнага, што ў гэтым часе ведамы толькі адзін факт беларускага казаньня з касьцельнай амбоны. Біскуп Кубіцкі гэтак аб ім піша: „Кс. Ян Баркоўскі, вікары парафіі Тургельскай, Віленскага пав., за згодай свайго пробаршча, 23 мінулага лістапада 1869 г. сказаў казаньне пабеларуску“ *(бач. 357)*. Ці зрабіў гэны вікары гэта з пракананьня, ці толькі з волі свайго пробаршча, ці пачуваўся да беларускасьці, ці можа, як-бы выглядала з прозьвішча, быў шляхціцам і паляком і ўважаў беларускую мову за меншае зло, як расейскую, — трудна сяньня вырашыць. Фактам аднак ёсьць, што ксёндз гэны сваім казаньнем, як гэта можна было й спадзявацца, лішняга захопленьня ў расейскіх уладаў ня выклікаў, бо калі іншыя за запачаткаваньне мовы расейскай у касьцеле атрымалі ордэры сьв. Станіслава 2 ці 3 ступені, крыжы на грудзі, лепшыя парафіі, або былі прадстаўлены да ўрадавай нагароды,— аб Баркоўскім гісторык толькі натуе: „ёсьць праект унесьці яго ў агульны сьпісок з тымі, каторых урад мае адрожніць“ *(там-жа)*. Здабыча такім чынам для кар'еры ксяндза Баркоўскага дужа малая, або й проста ніякая. Аб самай асобе гэтага ксяндза знаходзім жменьку вестак, першы раз у віленскім „Ordo divini Officii... 1865“. Меў ён тады 46 гадоў жыцьця і 22 сьвяшчэнства. Належыў да манахаў Канонікаў Рэгулярных Лятэранэнскіх (СС. RR. LL.), якія мелі свае манастыры ў Вільні ў сьв. Пятра і Паўла на Антаколю, у Краменіцы Ваўкавыскай... Займаў тады пасаду вікарага ў Слабодцы, у 1871 годзе быў пробаршчам у Лаварышках (Ordo... 1871), у 1873 г. пробаршчам у Відзенішках (Ordo... 1873). З тых-жа крыніц можам устанавіць, што тагочасным (быў ім ужо ў 1869 г.) пробаршчам у Тургелях, із згоды якога, а найхутчэй загаду, сказаў кс. Баркоўскі беларускае казаньне, быў кс. Язэп Вельжэўскі, што меў тады 57 г. жыцьця і 33 гады сьвяшчэнства. Паводле Ordo... 1850, быў ён у гэтым годзе пробаршчам у Ракішках (дэканату Абэльскага), Ordo... 1862 — вікарым у Алькеніках (дэк. Мэрэцкага), Ordo... 1863 і 1864 пробаршчам у Чабішках і віцэ-дзеканам Віленскім. Ordo... 1865 і 1866 падае яго, як пробаршча ў Немонайцях (дэк. Мэрэцкага). У 1873 г. пробаршчам у Дзявенішках (Ordo... 1873).

Далей цікавай ёсьць для нас у працы біскупа Кубіцкага паданая ў скарочаньні справаздача (на 22 бачынах друку in 8⁰) генэрал-губэрнатара Міх. графа Мураўёва цару Аляксандру II з урадаваньня свайго ў Вільні. Даў у ім Мураўёў доказ неабыякіх сваіх здольнасьцяў. Ведама, быў гэта тыран і дэспот, але таленавіты. Вось-жа ў гэтым рэтроспэкцыйным паглядзе на прошласьць краю прад паўстаньнем 1863 году, Мураўёў гэтак піша: „Найбольш уплывовым быў біскуп жмудзкі Валанчэўскі, каторы ў 40-вых гадох, а знача прад тым, як стаўся біскупам, заахвочваў да думкі аб уласнай бацькаўшчыне, вучыў дзяцей папольску *(NB. напэўна ня толькі папольску!)* і пісаў розныя падбураючыя

адозвы. Далей у гадох 50-х пад яго ўплывам паказаўся лемантар жмудзкі *і беларускі ў польскай мове,* а ксяндзы пераадзяваліся за прыставаў (?) і праводзілі пропаганду друкаў“ *(бач. 387)*. Гэты ўступ із справаздачы пазваляе нам разагнаць цемру, якая засланяла дагэтуль выданую 100 гадоў таму (у 1835 г.) першую каталіцкую беларускую катахізмоўку, уложаную разам з лемантаром польскім. Бп. Казімер-Мацей Волончэўскі (1850—1875) спаткаўся бліжэй і даўжэй з праблемай беларускай мовы ў Вільні два разы: раз, калі ў 1824—1828 г.г. студыяваў багаслоўе ў тагочасным віленскім унівэрсытэце, а другі раз, калі ў 1839 г. запрошаны быў у Віленскую Духоўную Акадэмію, як ад'юнкт катэдры пасторальнага багаслоўя і біблійнай археолёгії. Тут ён і доктарызаваўся 29. VII. 1842. У гэтым часе працаваў ён у Вільні аж пакуль гэтай акадэміі не перанесьлі ў Пецярбург. Бязсумніву, і апрача гэтага бываў ён яшчэ ў Вільні—раз карацей, другі раз даўжэй. Пры тым час студыяў Волончэўскага ў Вільні зьбягаецца з датай павароту маладога прафэсара М. Баброўскага з заграніцы, калі прозьвішча гэта прыцягвала да сябе думкі моладзі агулам, а духоўнай прадусім, бо-ж прывёз ён з сабой з Зах. Эўропы сьветлы і адраджэнчы павеў.

Сярод прафэсараў тагочаснага віленскага ўнівэрсытэту быў так-жа ведамы Ігнат Даніловіч, каторага праца і зацікаўленьне з галіны навукі права зьбліжыла яго да праблемы беларускай, ці да праблемы народу, каторы выдаў з сябе так цікавы памятнік краёвага права, як Літоўскі Статут. Ня трэба было тады шукаць сярод тагочасных віленскіх студэнтаў людзей, што вышлі з асяродзьдзя шчыра беларускага або былі першым толькі пакаленьнем, каторае толькі што рвалася, каб асымілявацца з палякамі. (Тагочасныя палякі ў працівенстве да сучасных мелі глыбокі і нефалшаваны сэнтымэнт да беларускасьці, хоць рэгіоналізм ня быў ім ведамы нават з назову).

Усё гэта разам узятае мусіла надаць псыхіцы Волончэўскага пэўны кірунак, які выліўся ў дасканальна згарманізаваную дваістасьць яго прац і заслугаў у гісторыі Касьцёла й Краю. У гісторыі Касьцёла запісаўся ён, як цьвёрды і мудры баяўнік яго правоў і вольнасьці, а ў гісторыі Літвы, а як сяньня ўжо бачым і Беларусі, астанецца яго прозьвішча зьвязана з пачаткамі адраджэньня беларускага народу, праз сьцьверджаньне аснаўных яго правоў на ўжываньне ў касьцеле роднай мовы.

Толькі гэткае, як сказана вышэй, спрыяньне справе беларускай мовы ў Касьцеле ў Беларусі мае непадробленую для Беларусаў вартасьць, а іншае, якое выяўляў царскі ўрад, было заўсёды небясьпечным. Дзеля гэтага натуем вылучна па хронікарску, што так-жа, як піша біскуп Кубіцкі, „дырэктар дэпартаманту спраў духоўных чужых вызнаньняў 23. IX. 1906 г. за № 5090 прысылае генэрал-губэрнатару (Кржывіцкаму) поўафіцыяльны ліст, у якім паведамляе яго, што рэфэраваў міністру ўнутраных спраў аб імкненьні прадстаўнікоў Каталіцкага Касьцёла паляні-

заваць Літоўцаў і Беларусаў, а так-жа, што казаў тады аб двух способах, каторыя маюць праціўдзеіць гэтай рабоце: 1) назначыць біскупам біскупа-суфрагана літоўца і 2) увясьці расейскую мову (*sic*) і беларускую ў дадатковае каталіцкае набажэнства" *(бач. 257).*

Належыла-б для паўнаты абраза дасьледзіць Дѣло Канц. Віленск. Ген.-Губерн. з 1906 г. пад загалоўкам „Бѣлоруссы, Литвины и польское католическое вліяніе".

М. ПЯЦЮКЕВІЧ

Беларуская мэлёграфія

(бібліографічны нарыс)

(*Даканчэньне*).

У Усходняй Беларусі з ранейшых гадоў надрукаваны: Кашын В. „Белорускіе мотивы для смешанного хора". Выпуск I. Бабруйск [1918].

Аб выданьнях мэлёграфічных за апошнія 10—15 гадоў у Савецкай Беларусі даведываемся з наступных жаролаў: „Матар'ялы да беларускай бібліографіі. Т. 4. Этнографія. Менск. 1927 г.", часапіс „Літаратура і Мастацтва", які выходзіць у Менску — гэты апошні маем да дыспозыцыі толькі за 1934/5 г. і бягучыя гады і „Звязда" 1931—1935 гг. і бягучы.

З перадваенных запісаў мы ў жаролах знаходзім наступныя: некалькі вясельных мэлёдыяў, запісаў Шыдлоўскі і выдрукаваў у „Tygodniku Wileńskim" з 1819 г., а такжа некалькі мэлёдыяў з Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ. зап. М. Чарноўская і выдрукавала ў „Dzienniku Wileńskim" з 1817 г., А. Абрамовіч — „Rocznik Literacki" з 1843 г. і М. Анцаў — „Баянъ", з 1904 г.

У зборніку Н. Кленоўскага: „Этнографическій Концертъ. Сборникъ народныхъ песѣнь русскихъ и инородческихъ". Масква 1894(?) ёсьць таксама некалькі беларускіх песень.

О. Гулак-Артемовскій „Народні укр. пісні з голосом (выд. 2 з 1883 г.) — тут таксама зьмешчаны 3 беларускія народныя песьні з нотамі; 35 белар. нар. песень зьмяшчае П. Сокальскій: „Малорусскія и бѣлорусскія пѣсні" (1903 г.). Л. Куба (Beloruská národ. písen. Uwahy z hudební cesty". Slov. Sbornik t. 6. з 1887 h.; „Slovanstvo v svych zpewech", t. 6, z 1885—1888 h.) — у гэтай даведцы Куба ўспамінае аб зборніку 50 белар. народн. песень запісаных Корошчэнкам, аднак гэтага зборніка не паказывае ніводная з бібліографіяў.

У гадох 1883/4 шмат сабраў бел. нар. песень з Палесься ведамы польскі этнограф Ч. Пяткевіч, але рукапісы гэтых песень згінулі.

Маем таксаме некалькі твораў музычных і песень запісаных Шэйнам (глядзі: Матеріалы... Т. 1, ч. 1 і ч. 2).

Янчук падае ў сваей працы: „По Минской губерніі" 1889 г. 39 бел. нар. мэлёдыяў.

Ведамы беларускі этнограф Віцебшчыны Н. Нікіфароўскі напісаў працу аб жабраках і музыках вясковых, дзе між іншым кажа аб замілаваньні беларускага народу да музыкі („Этнографическое Обозрѣніе" Т. 4. 1892 г.); да аднэй з прац ён далучыў 3 жабрацкія песьні.

Успомнены вышэй Шэйн з Віцебшчыны запісаў толькі адну нар. мэл., а з Смаленшчыны—23 мэлёдыі (Матеріалы... Т I. ч. 1 і 2).

Шэйн друкуе ў сваім зборніку 5 нар. мэл. з Магілёўшчыны, Раманаў—12 мэл. (у 1912 г.) і Зінаіда Радчэнко 180 бел. нар. мэл. (Сборникъ малорусскихъ і бѣлорусскихъ народных песенъ Могілевской губ. Гомельскаго уѣзда, Дятловицкой волости 1911 г.).

У 1928 г. Інбелкульт у Менску выдаў вельмі цэнны зборнік бел. нар. песень з Магілёўшчыны (М. Гарэцкі і А. Ягораў: „Народныя песьні з мэлёдыямі"). Гэты зборнік зьмяшчае ў сабе 318 песень з мэлёдыямі, запісанымі ад 60-цігадовай старушкі — маткі Максіма Гарэцкага—з в. Багацькаўка (Магілёўшчына). Як падае праф. К. Мошыньскі (Lud Słowiański T. III. z. 1, 1932) на пагранічны Магілёўшчыны ў Чарнігаўшчыне і зах. частцы Палесься запісаў шмат бел. нар. песень украінскі музыколёг-этнограф Кл. Квітка, з друку гэтыя песьні яшчэ ня вышлі.

З Меншчыны, як пабачым, няшмат выдрукавана бел. нар. песень.

У ранейшую пару першы прыступіў да эксплёатацыі мэлёграфічных матар'ялаў у Меншчыне Н. Янчук, які зьмясьціў народн. песьні ў кніжцы „По Минской губерніі", 1889 г., — падаў ён 39 песень. Таксама Шэйн зьмясьціў 5 песень з Меншчыны (Матеріалы... Т. 1, ч. 1).

Сербаў у сваім зборніку „Бѣлоруссы — Сакуны", 1915 г., падае 23 песьні з б. Меншчыны.

Апрача гэтага на ўсей тэрыторыі Беларусі за выняткам Горадзеншчыны зьбіраў бел. нар. песьні ведамы А. Грыневіч. Праф. Ст. Казура таксама друкаваў бел. нар. песьні. У Вільні (перад выездам у Менск) меў ён каля 500 песень.

Калі разгледзім беларускае Палесьсе, то справа мэлёграфічная горш прадстаўляецца ад іншых беларускіх земляў. Апрача некалькіх мэлёдыяў, выдрукаваных у розных выдавецтвах, ніводнай паважнейшай працы ня маем.

Затое ёсьць добры матар'ял і даволі багаты, які, нажаль, яшчэ недрукаваны. Матар'ялы Р. Шырмы, сабраныя з пав. Пружанскага, маюць вялікую вартасьць. У 1932 г. у пав. Лунінецкім і Столінскім фонографам запісываў нар. песьні праф. Колэсса пры супрацоўніцтве праф. К. Мошыньскага; запісалі яны агулам мэлёдыяў сьпеўных і музычных 236.

Гэтыя песьні, як бачым, запісаныя на этнографічных землях беларускага Палесься, ад беларускага насельніцтва. Аднак, ча-

мусьці, ня можа іх прызнаць беларускімі прафэсар Колэсса. Ён кажа: „песьні палескія (лунінецкія і столінскія) адзначаюцца пэўнай афарбоўкай лёкальнай, але агулам маюць яны характар выразна ўкраінскі“ (L. S. T. III. 1). Нажаль і праф. Мошыньскі ў гэтай справе не заняў здэцыдаванага становішча, а пазбыўся такім сказам: „Naturalnie, trzebaby jeszcze porównać je z rdzennie białoruskiemi, bo kto wie, czy cała wogóle muzyka ludowa Białorusi, za wyjątkiem północnych i północno-wschodnich części tego kraju nie okaże się bardzo blizką ukraińskiej. A priori wydaje mi się to dość prawdopodobne“.

Як справа прадстаўляецца з мэлёграфічнай працай на Палесьсі Савецкай Беларусі, сказаць ня можам, бо бібліографічныя жаролы не паказываюць ніякіх новых пазыцыяў. Адно можна дапушчаць, што матар'ялы сабраныя дзеколечы знаходзяцца ў рукапісах. І, паўторым тут за Дрэйзіным, беларускім кампазытарам, што каля 1927 году Музычная Падсэкцыя Інстытуту Беларускай Культуры ў Менску „мела багаты матар'ял, які складаўся з некалькі тысячаў беларускіх народных песьняў - прымітываў“. Магчыма ёсьць там і з Палесься. А таксама нейкія рукапісныя матар'ялы нотаў бел. нар. музыкі павінны знаходзіцца ў Расеі — гэта няма сумніву, — бо каля 1908 г. быў прыехаўшы ў Беларусь у справах музычна-этнографічных ведамы расейскі дасьледчык А. Л. Маслов з Масквы.

На падставе тых жаролаў, якія мы маем аб мэлёграфічнай працы ў Савецкай Беларусі, — можна сказаць, што там праца пакрысе пасуваецца наперад. І нічога дзіўнага, бо Сав. Беларусь ужо выкваліфікавала кадры спэцыялістаў на гэтаў ніве і мае сродкі на экспэдыцыі і выдавецтвы.

Пералічым тыя зборнікі беларускіх народных песень і паадзіночныя песьні згарманізаваныя і незгарманізаваныя, якія вышлі ў Савецкай Беларусі ад 1925 г. да апошніх часоў, а мною яшчэ няўспомненыя.

1925 год:

Мацісон, М.: Сьпеўнік для дзіцячых хораў. Масква. 1925 г. (зьмешчаны тут і народныя песьні).

1926 год:

Тэраўскі, У.: Сьпеўнік. Менск. 1926 г. Д. В. Б. стр. 49.
Здановіч, И. К.: Белорускиe народные песні Гродненской губ. м. Селец. Вып. 1. Москва 1926.
Прохараў, Я.: Зялёны дубочак. Народны раманс. Менск 1926. Б. Д. В.

1928 год:

Луцэвіч Уладыслава і Савёнак, А.: Дашкольны сьпеўнік для дзіцячых садоў і мал. груп пач. школ. Пад рэд. М. Мацісона. Менск 1928. Д. В. Б.

Беларускія народныя песьні солёвыя і харавыя ў апрацаваньні Аладава М., Іпалітава - Іванава М. і Прохарава Я. Менск 1928. Б. Д. В.
Гарэцкі М. і Ягораў Я. (Глядзі вышэй).

1929 год:

(ня вышла з друку ніводная вялікшая праца, а толькі паадзіночныя песьні).
Прохараў Я.: Ах, ты зорка мая. Народная. Менск 1929. Б.Д.В.
„ Ой рана, рана ды на зары. Вясельная са Смаленшчыны. Менск 1929.
Нікольскі А.: А ў лесе. Валачобная. Менск 1929. Б. Д. В.

1930 год:

Анцаў Мік.: Го-го-го — каза. (Калядная). Менск 1930.
Аладаў Мік.: Мужык жыта прадае. Менск 1930.
„ Дажынаю жыта. Менск 1930.
Равенскі М.: Як стаяла белая бяроза. Менск 1930.
„ Прыляцелі гусі. Менск 1930.
„ Ня стой каліна. Менск 1930.
Нікольскі А.: Дзе ты, хмелю зімаваў. Менск. 1930.
Туранкоў А.: Ой, з пад лесу, лесу цёмнага. Менск 1930 г.
Іпалітаў-Іванаў: Ой, ты бела бяроза. Вясьнянка. Менск 1930.
Грэчанінаў А.: А ды ня пыл па дарожцы. Менск 1930.
„ Цяпер Купала. Купальская. Менск 1930.
„ Ляцела зязюля. Вясельная — з Лепельшчыны. Менск 1930.

Адносна далейшых выдавецтваў беларускай народнай песьні за гады 1931—1935 ня маем амаль ніякіх вестак. „Летапіс Беларускага Друку БССР“ ня выказывае.

У апошнія часы ў Савецкай Беларусі працуе над беларускай нар. песьняй 66-гадовы, але энэргічны старац, кампазытар Н. Н. Чуркін, беларус. Ён мае запісаных каля 1000 нар. белар. песень, пераважна з Магілёўшчыны. — Як кажа Ю. Лявонны: „Чуркін вёў вялікую барацьбу з упартасьцю старых рэнэгатаў, настроеных супроць беларускай народнай песьні“. („Літаратура і Мастацтва“ № 44. 1935 г.).

Найздальнейшы і найбольш выдатны кампазытар Аўген Цікоцкі глыбока разумее бел. нар. песьні і свае кампазыцыі абасноўвае пераважна на матывах нар. песьні, а таксама гарманізуе і распрацоўвае нар. песьні для хораў і менскага радыя і Тэатру Опэры і Балета.

Кампазытар Н. Самохін апошнім часам напісаў сюіту на беларускія народныя тэмы. Кампазытар Дрэйзін працаваў у радыё, у Тэатры Опэры і Балета і ў Кансэрваторыі. Яго кампазыцыі апіраюцца на матывах бел. нар. песьні. Песьню беларускую ён добра знае, бо над ёй шмат працаваў. За „нацдэмаўшчыну“ зьняты з займаных становішчаў.

На гарызонце беларускага музычнага творства паказаўся малады і здольны кампазытар Рыгор Пукст. Цяпер ён працуе выкладчыкам у Гомельскім музычным тэхнікуме. Любан піша ў „Звяздзе“ № 219 з 1935 г. аб Пуксце так: „Рад рамансаў, камэрных твораў, некалькі гармонізацый народных песень, музычнае афармленьне тэатральных п'ес, нарэшце сымфонія ў чатырох частках на тэму беларускіх народных песень — вось творчы багаж кампазытара за параўнальна невялікі час яго работы ў БССР“.

У апошнія гады праявіў вялікі майстэрскі размах і творчую плоднасьць кампазытар А. Туранкоў. Аб ім у „Літаратуры і Мастацтве“ № 1, 1935 г. пішыцца так: „Туранкоў, як кампазытар, нясупынна расьце, прычым вялікае месца займае ў яго творчасьці народная песьня, якая распрацовываецца ім у розных выглядах пісаньня“.

Да наймалодшых, найбольш здольных і працавітых кампазытараў залічаецца Ісак Любан. Ён, як і пісьменьнік Бядуля, моцна ўросься ў глебу беларускай народнай культуры, добра яе знае і цалком ей пасьвяціўся, пасьвяціўся іменна на ніве музычнай. Аб Любане „Звязда“ № 217 з 1935 г. гэтак піша: „Гэта імкненьне кампазытара да песеннай творчасьці перанесена ім на беларускую народную песьню. Наўрад ці ёсьць яшчэ адзін такі музыка ў Беларусі, які так добра ведаў-бы беларускі песенны фальклёр, як Любан. Ім гарманізавана шмат народных песень“.

Ёсьць яшчэ цэлы рад кампазытараў у БССР, якія даволі многа прысьвячаюць увагі беларускай народнай песьні, напр. Аладаў, Палонскі, Падкавыраў, Багатыроў, Іпалітаў-Іванаў, Іваноў, а таксама „нацдэмы“: Анцаў, Прохараў, Шепелеўскі, Дрэйзін, Мацісон і Бэргельсон (гэты „трацкісты“), Казакоў і Панаева, якія працавалі на ніве беларускай народнай песьні.

Паміма аднак усяго, калі возьмем пад увагу кадры цяперашніх працаўнікоў на ніве беларускай народнай музыкі, то можам быць аптымістымі і верыць у тое, што беларуская народная песьня ў Савецкай Беларусі не памрэ разам са старым пакаленьнем, якое яе пяяла. Горшая справа ў нас, тут: мы ня маем ані кваліфікаваных работнікаў ані сродкаў на выдрукаваньне нават тых матар'ялаў, якія ёсьць сабраныя.

Жаролы, з якіх аўтар карыстаў пры пісаньні артыкулу:

1. Большая Советская Энциклопедия. Т. 5. Москва. 1930.
2. Д. Зеленин: Бібліографіческій указатель русской этнографической литературы. С.-Петербург. 1913.
3. Fr. Gawełek: Bibljografja ludoznawstwa litewskiego. Wilno 1914.
4. J. St. Bystroń: Bibljografja etnografji polskiej. T. 1. Kraków. 1929.
5. Матар'ялы да беларускае бібліографіі. Т. IV. Этнографія. Менск. 1927. Інстытут Беларускае Культуры.

6. K. Moszyński: Stan obecny melografji rdzennej Białorusi i Polesia. Lud Słowiański. T. III. zesz. 1. Dział B.: Etnografja. Kraków 1932.
7. K. Moszyński: O badaniach muzyczno-etnograficznych na Polesiu w r. 1932. Lud słowiański. T. III. zesz. 1... 1932.
8. „Літаратура і Мастацтва“ (Часапіс літаратуры і крытыкі). Орган Аб'яднаньня Пралетар. Пісьменьнікаў Беларусі. Менск. 1934—1935.
9. „Звязда“. Орган ЦК і МК КП(б) Б, ЦВК і СНК БССР. Менск. 1935.
10. Вусныя інфармацыі асоб працуючых над беларускай народнай песьняй.

КНІГАПІС

Stanisław Stankiewicz — **Pierwiastki Białoruskie w Polskiej Poezji Romantycznej.** Część I (Do roku 1830). Wyd. T-wa Pomocy Naukowej im. E. E. Wróblewskich. Wilno, 1936, 25 × 16 cm. str. 301.

Ёсьць гэта праца аўтара на доктарскі дыплём. Як відаць з загалоўку, мэта яе — выказаць у польскай романтычнай паэзіі беларускі элемэнт, як уплывы беларускай мовы і беларускага народнага творства — як песьні, байкі і інш. Абымае яна першы пэрыяд польскай романтычнай літаратуры, гэта знача: ад пачатку да 1830 г. Над наступным пэрыядам, ад 1830 да 1863 аўтар, як зазначае ў прадмове першай часьці, працуе далей.

Яшчэ ў 1911 г. на падобную тэму, шукаючы ў польскай романтычнай літаратуры элемэнтаў літоўскіх, напісаў працу Фр. Аугустайтіс, пад наз.: „Pierwiastki litewskie we wczesnym romantyzmie polskim“. Цяпер-жа, дасьледжваючы ў гэнай літаратуры элемэнт беларускі, выступае з больш шырокай і грунтоўнай працай Ст. Станкевіч.

Пераглядзіўшы з большага гэну працу, можна зрабіць аб ёй наступныя, прадусім дадатныя ўвагі. Кніжка гэта грунтоўная, паважная. Шмат у яе аўтар улажыў працы і веды, выказваючы сусім саліднае навуковае прыгатаваньне як што да самай справы, так і навуковай мэтоды.

Беларускія элемэнты Ст. Ст. дасьледжваў у Зана, Чэчата, Петрашкевіча, Лазінскага, Міцкевіча, Адынца, Ходзькі і іншых. Вось-жа аўтар, напаткаўшы ў іх твораў дасьледжаны беларускі элемэнт, даказвае яго „аўтэнтычнасьць“ славамі і тэкстамі з беларускага фольклёру, зачэрпнутага з беларускіх этнографічных зборнікаў, або з беларускай песьні, беспасрэдна ўзятай ад народу. Дзеля гэтай мэты Ст. Ст. нятолькі прастудыяваў многа беларускіх этнографічных зборнікаў, але так-жа пабываў у Наваградчыне, ходзячы як-бы па сьлядох Міцкевіча, дзе шмат што патрэбнае для пацьверджаньня сваей тэзы здабыў беспасрэдна ад народу.

Далей праца Ст. Ст. ёсьць наглядным і вымоўным сьведкам, як многа духовага багацьця мае наш беларускі народ і як многа з яго скарыстаў ня ён сам, але ягоны сусед. Над гэтым усім як-жа паважна павінны прызадумацца нашы паэты, пісьменьнікі, культурныя дзеячы, палітыкі!

Нямала ўрэшце праца Ст. Ст. можа прычыніцца і дзеля вывучэньня беларускай мовы. Справа ў тым, што многія беларусы на гэты бок савецка-польскай граніцы, асабліва адарваныя ад вёскі інтэлігэнты, у свой беларускі слоўнік, а нават у адмену слоў і ў будову сказаў часта дапускаюць проста крычачыя полёнізмы. Вось-жа ўважнае прасьледжаньне працы Ст. Станкевіча, тых імення мясцоў, дзе аўтар выказвае беларусыцызмы, асабліва дзе калі разглядае творчасьць Міцкевіча, сапраўды можа шмат у чым і шмат каго навучыць беларускай мовы, якой ня брыдзіліся й польскія пісьменьнікі.

Але хоць і павярхоўна разглядаючы працу Ст. Станкевіча, кідаюцца ў вочы яе так-жа і заганы. Прадусім недахват гістарычна-соцыялёгічнага тла, на якім адбывалася на землях бышага Вял. Княства Літоўскага польскае літаратурнае романтычнае творства, што так багата скарысталa з беларускага фольклёру.

Праўда, аўтар на пачатку сваей працы памяшчае першы разьдзел „U źródeł regjonalizmu białoruskiego“, у якім малюе як-бы тло для сваіх досьледаў. Робіць аднак гэта ён бадай выключна толькі з пункту гледжаньня польскага літаратурнага романтызму. А гістарычна-соцыяльнае тло дало-б нам нямала сьвятла на тую праблему, чаму так багата польскія романтычныя пісьменьнікі ў сваё творства ўводзілі беларускі элемэнт. Гэткае тло выказала-б, што гэта было ў іхнай псыхіцы, у іхным пераважна беларускім паходжаньні, у іхных беларускіх традыцыях.

Калі-б на гэта Ст. Станкевіч зьвярнуў большую ўвагу ў сваей працы, дык праца яго ня мела-б таго польскага рэгіоналізму, пад кутом гледжаньня каторага яна ўся збудавана, а што, на наш пагляд, ёсьць заганай яго працы. Зразумела, што Ст. Станкевіч апрацоўваючы тэму з галіны польскай літаратуры, лёгічна рэчы разважаючы, з пункту польскага гледжаньня мог і ня сходзіць, але калі-б хоць крыху да сваей працы даліў ён сосу гісторыязофічнага, праца яго была-б яшчэ больш паважнай, больш аб'ектыўнай адносна да беларускай праблемы і больш гармонійнай да беларускага нацыянальнага пачуцьця самога аўтара.

Агулам, здаецца нам, што студэнты беларусы гэткіх „трэфных“ і „небясьпечных“ тэмаў не павінны браць, а калі дзеля тых ці іншых прычын бяруць іх, дык усё-ж павінны яны іх апрацоўваць так, каб праца іх ні ў чым ня была супярэчнай і з беларускай праўдай. Але калі гэта ўсё ад нашых студэнтаў незалежна, дык на гэта ўжо сапраўды няма рады.

Ня шкодзіла-б так-жа, каб аўтар „Pierwiastków Białoruskich w Polskiej Poezji Romantycznej“ у працы сваей даў сьпісак тых крыніц і тэй літаратуры, з якой так багата карыстаўся. Спадзяёмся, што зробіць ён гэта ў наступным томе, якога нецярпліва чакаем.

Ад. Ст.

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

Мэтад буквара „Першыя Зерняткі" *)

(увагі аўтара)

Буквар прызначаны перадусім для хатняга навучаньня ці самаадукацыі.

Гэтым абумоўліваюцца яго мэтадычныя асаблівасьці.

Аўтар абраў мэтад сынтэтычны, як найпрасьцейшы і найбольш у даным выпадку адпаведны: ад азнаямленьня з буквамі вучань — мінаючы звычайнае чытаньне па складах — пераходзіць адразу да чытаньня зложаных з гэтых буквaў цэлых слоў, на пачатку адна- і — двускладовых, а пасьля больш складаных, і наканец цэлых сказаў.

Каб палягчыць, па магчымасьці, вывучэньне граматы, аўтар, кладучы ў васнову першае і кардынальнае вымаганьне пэдагогікі — йсьці заўсёды ад лёгкага і простага да больш цяжкога і складанага — карыстаецца і некаторымі асаблівымі прыёмамі ў распалажэньні букварнага матар'ялу, іменна:

I) прыёмам г. зв. „сугучнасьці і падобнасьці", напр.:

каса	*жук*	*зуб*	*гарод*	*дом*	*стол*	*коска*	*чарот*
кара	*жур*	*дуб*	*гарох*	*дым*	*столь*	*коська*	*чарапок*

II) прыёмам „нарастаньня", асабліва для вывучэньня злучэньняў некалькіх зычных, напр.:

лапа	*нара*	*шашок*	*рама*	*раса*	*хутка*	*трава*	*роў*
лапка	*норка*	*шышка*	*крама*	*краса*	*хустка*	*страва*	*кроў*
				краска	*пастка*		

III) як дапаможны сродак, буквар зьмяшчае на кожнае першае слова з новай буквай малюнак прадмету, які азначаецца гэтым словам;

IV) усе прыклады — словы бяруцца з навакольнага жыцьця і ёсьць азначэньнем знаёмых і нагляданых на кожным кроку прадметаў;

V) праз кожныя 7—8 бачын ідуць паўторныя бачыны, для лепшага замацаваньня набытых ужо навыкаў у чытаньні.

Навучаньне граматы заўсёды было і астанецца дзелам нялёгкім, асабліва ў сем'ях, дзе граматнасьць не прывілася, дзе дзеці зусім не падгатаваны да кніжкі. Таму і пры навучаньні з буквара „Першыя Зерняткі", як вучыцялі, так і вучні спаткаюцца з некаторымі труднасьцямі. Каб па магчымасьці зьменшыць гэтыя труднасьці, аўтар у практычных парадах, зьмешчаных на вокладцы, пад загалоўкам „Як вучыць чытаць і пісаць", рэкамэндуе некаторыя важнейшыя правілы, на якія трэба зьвярнуць увагу, так: —

I) **чытай як гаворыш,** г. ё. цэлымі славамі і сказамі, а не складамі;
II) **чытай, што бачыш** (па буквах) **і ў якім парадку бачыш;**
III) падчас чытаньня не адрывайся вачыма ад чытанага слова ці слоў;
IV) **чытай не сьпяшаючыся:** лепш марудна (гэта зусім натуральна), і правільна, чым хутка і няправільна, бо пасьля ўсёроўна прыдзецца затраціць нямала часу, каб перарабіць няправільныя навыкі;
V) **заўсёды думай, калі чытаеш і пішаш,** г. ё. прадстаўляй сабе прадмет, які адпавядае чытанаму слову; вучыцель час ад часу пытае: пакажы той прадмет, аб якім чытаеш і г. д. Калі няма перад вачыма гэтага прадмету, хай скажа, дзе яго можна бачыць, які ён і г. д;
VI) **хай вучань выяўляе як найбольш самадзейнасьці падчас чытаньня,** да ўсяго даходзіць сам, бяз помачы вучыцеля; вучыцель толькі кіруе, зварочвае ўвагу...
VII) пісьмо трэба так вясьці, каб вучань ніколі не памыляўся... І зноў-жа: лепш марудна і правільна, — чым хутка і няправільна...
VIII) першыя лекцыі вымагаюць ад вучыцеля асаблівае ўважлівасьці і нагляданьня, бо тут закладаюцца навыкі, ад якіх будзе залежаць пасьпех усяго далейшага навучаньня.

Буквар надрукаваны чатырма шрыфтамі, пачынаючы вялікімі і канчаючы звычайнымі. Увесь буквар надрукаваны гражданкай, але даецца азнаямленьне і з лацінкаю. Узоры пісьма зьмешчаны на чатырох старонках. Зьмест пасьля ўласна-букварнай часьці складаюць кароткія апавяданьні і вершы нашых паэтаў-клясыкаў і паэтаў заходне-беларускіх. Ёсьць даволі загадак, прыказак, народных прымет, казкі, жарты, скарагаворкі і т. пад. Характар буквара — чыста беларускі, народны. У ім усё беларускае.

У буквары 137 малюнкаў.

„Першыя Зерняткі" — гэта першы беларускі буквар для хатняга навучаньня.

Пэўне-ж, ёсьць у ім пэўныя заганы, недакладнасьці. Аўтар будзе толькі ўдзячны, калі крытыка зьверне на іх увагу.

Патрэба такой кніжкі адчувалася даўно. Аўтар падрыхтоўваў свой буквар у працягу 5 — 6 год.

Сяргей Паўловіч.

*) „Першыя Зерняткі", беларуская граматка для хатняга навучаньня. Фармат 8-°. Бач. 96. Вільня, 1936.

ХРОНІКА

══ 6-га чэрвеня сёлета адбылося ў Вільні ўрачыстае сьвяткаваньне 10-тых угодкаў сьмерці беларускага пісьменьніка і паэта Казімера Сваяка (кс. Кастантага Стэповіча). Сьвяткаваньне зарганізаваў адумысловы камітэт, у складзе паэта Міхася Машары, кс. Ад. Станкевіча, брата Сваяка — гр. Я. Стэповіча, інж. Л. Дубейкаўскага і інж. Ад. Клімовіча. У праграму сьвяткаваньня ўходзілі: адкрыцьце помніка на магілцы паэта (магільнік Росса) і акадэмія. Помнік Сваяку ўфундаваны з ахвяр беларускага грамадзянства, сабраных успомненым камітэтам.

Пры прысутнасьці некалькі соцен Беларусаў, так з вёскі, як і з Вільні, а гадзіне 6-й вечарам таварыш і апякун Сваяка кс. Адам Станкевіч адкрыў помнік і сказаў прамову, у якой прадставіў заслугі прадчасна памёршага паэта перад беларускім народам, ягоным адраджэньнем і культурай. Другі прамоўца, кс. В. Гадлеўскі, падзяліўся з прысутнымі ўспамінамі аб Сваяку. Урачыстае адкрыцьце закончылася адсьпяваньнем беларускіх рэлігійных песень.

Акадэмія ў чэсьць Сваяка адбылася ў залі Бел. Інстытуту Гаспад. і Культуры, зараз па адкрыцьці помніка. Пры перапоўненай аўдыторыі, кс. Адам Станкевіч прачытаў рэфэрат аб жыцьці і творстве Каз. Сваяка, а Хор Інстытуту прапяяў жалобны марш. Рэфэрат кс. Станкевіча будзе надрукаваны ў наступнай кніжцы „Калосься“.

══ У Беларускім Музэі Ів. Луцкевіча ў Вільні сёлета значна ўзрасла лічба адведываючых асоб і экскурсіяў. За першыя 6 месяцаў 1936 г. было ў Музэі 819 асоб—супраць 371 за той-жа час у 1935 г.

У сувязі з гэтым, у траўні і чэрвені Дырэкцыя Музэю наладзіла курс выкладаў для праваднікоў па Музэю, у якім прыймала ўчасьце беларуская студэнцкая моладзь.

У Музэй паступілі цікаўныя ахвяры ў пастаці архіўных матарыялаў, кніжак і розных экспонатаў.

Дзеля таго, што лішне цеснае памяшчэньне Музэю не дае магчымасьці выставіць дзеля агляду ўсіх сабраных рэчаў, Дырэкцыя Музэю дбае аб павялічэньні Музэйнага памяшчэньня.

══ Яшчэ ў красавіку Урад Беларускага Навуковага Т-ва, выпаўняючы пастанову Агульнага Сходу Т-ва, паслаў дэлегацыю да прэзыдэнта места Вільні з мэморыялам, у каторым прасіў назваць адну з віленскіх вуліц імем д-ра Францішка Скарыны, закладчыка першае (беларускае) друкарні ў Вільні, у сувязі з 450-лецьцем ягоных нарадзінаў, якое беларускае грамадзянства сёлета абходзіла. Ня гледзячы на абяцаньне прэзыдэнта места, што справа гэтая пойдзе на разгляд мястовае рады, — дагэтуль нічога ў кірунку рэалізацыі гэтага мястовы самаўрад не зрабіў.

══ На адбыты ў Варшаве 31-га траўня, 1 і 2 чэрвеня Зьезд Бібліатэкараў з усяе Польшчы, ад Бібліатэкі Беларускага Навуковага Т-ва езьдзілі: бібліатэкар Ул Самойла і працаўніца Б-кі М. Мілючанка.

На адбытым адначасна ў Варшаве ўрачыстым абходзе 30-лецьця культурна-навуковае працы ўкраінскага дзеяча праф. Огіенка прамаўлялі беларускія дэлегаты: грам. Самойла — ад імя Белар. Навук. Т-ва і гр. Мілючанка — ад імя моладзі.

══ Беларускі пісьменьнік і паэт Вінцук Адважны, вярнуўшыся з далёкай чужыны на бацькаўшчыну, у пачатку ліпня адведаў нашую рэдакцыю. Паэт у гутарцы з сябрамі рэдакцыі выражаў сваё задаваленьне з нашага часапісу і дзяліўся намерамі сваей творчай працы.

══ Вышлі з друку: „Лёгкі хлеб“ М. Машары — драма ў трох актах з жыцьця вясковай моладзі, фармат 8-⁰, бач. 64, і зборнік вершаў другога заходне-беларускага песьняра Максіма Танка. Зборнік завецца „На этапах“. Фармат 8-⁰, бач. 144.

* * *

══ Сэсія Беларускай Акадэміі Навук адбылася ў Менску дня 20—24 траўня. Сэсія выслухала справаздаўчыя даклады з дзейнасьці Акадэміі ў 1935 г., зацьвердзіла плян працы Акадэміі на 1936 год і прыняла новы Статут Акадэміі.

Шчарбакоў у сваей справаздачы з дзейнасьці Акадэміі за 1935 г. адзначыў, што Акадэмія была „засьмечана” значным лікам клясава—чужых, варожых элемэнтаў. Былое кіраўніцтва Акадэміі праяўляла „гніла-лібэральныя адносіны да клясава-чужых, нацыяналістычных, трацкісцкіх, бундаўскіх і іншых варожых элемэнтаў“. У Акадэміі „недастаткова яшчэ разгорнута работа па выяўленьню, уцягненьню і выхаваньню кадраў вучоных з моладзі і ў асаблівасьці нацыянальных беларускіх кадраў“.

За апошнія 4—5 год колькасьць навуковых працаўнікоў Акадэміі вырасла з 142 да 253, але кваліфікацыя іх далёка яшчэ нездавальняючая. Плян тэматычны Акадэміі выкананы ня поўнасьцю. Акадэмія ў 1935 г. выпусьціла друкам 122 назовы прац, абоймам 738 друкаваных аркушаў.

А ў другім сваім дакладзе, аб дзейнасьці Інстытуту Гісторыі, Шчарбакоў падчыркнуў нездавальняючае становішча з падрыхтоўкай кадраў гісторыкаў-марксыстаў у БССР, далёка нездавальняючае становішча Інстытуту Гісторыі ў выданьні навуковых працаў; Інстытут Гісторыі правёў вялікую барацьбу з нацдэмаўшчынай, нацдэмамі і інш. элемэнтамі (1929 — 1933 г.). Даклад аб дзейнасьці Інстытуту Аграглебазнаўства і ўгнаеньняў зрабіў Афанасьеў. Інстытут найбольш працаваў над праблемамі ўрадлівасьці глеб БССР. Шмат зроблена Інстытутам у кірунку картаграфіі, клясыфікацыі і гэнэзы глебы БССР. Дана гэнэтычная клясыфікацыя глеб, складзены глебавыя карты ўсей БССР, 70 раённых карт, устаноўлены і картаграфаваны аснаўныя глебавыя раёны БССР.

Прэзыдэнт Акадэміі Сурта зрабіў даклад аб пляне працы Акадэміі на 1936 год.

Сэсія, прыняўшы рэзолюцыі ў сувязі з справаздаўчымі дакладамі, і зацьвердзіўшы плян працы на 1936 г., аднагалосна зацьвердзіла новы Статут Акадэміі. Новы Статут мяняе назоў Акадэміі. Згодна з гэтым Статутам няма Беларускай Акадэміі Навук, ёсьць Акадэмія Навук БССР.

Новая Акадэмія складаецца з трох аддзяленьняў—грамадзкіх навук, матэматычных і прыродазнаўчых навук і тэхнічных навук. Аддзяленьні яднаюць інстытуты, габінэты, камісіі. Сэсія зацьвердзіла прэзыдыюм Акадэміі Навук БССР, у складзе: Сурта — прэзыдэнт, Колас — віцэпрэзыдэнт, Шчарбакоў — сакратар, Вольфсон — сакратар аддзяленьня грамадзкіх навук, Бурстын — сакратар аддзяленьня матэматычных і прыродазнаўчых навук, Панкевіч — сябра прэзыдыюму.

══ Усебеларуская (Сав.Беларусь) гэолёгічная конфэрэнцыя адбылася ў Менску. Конфэрэнцыя сьцьвердзіла, што ў БССР выканана значная праца ў кірунку вывучэньня прыродных багацьцяў БССР і гэолёгічнай будовы яе глеб. З агульнага ліку 126 тысяч квадратных кілёмэтраў тэрыторыі БССР, пакрыта гэолёгічнай здымкай розных маштабаў 103 тысячы квадратных кілёмэтраў; на тэрыторыі БССР знойдзена вялікая колькасьць шкляных пяскоў, агнетрывалых глін, фасфарытаў, даламітаў, што адкрывае пэрспэктывы дзеля разбудовы адпаведных промыслаў.

══ Сёлета спаўняецца 30-годзьдзе творчай дзейнасьці народнага паэта Якуба Коласа. Саюз Пісьменьнікаў Савецкай Беларусі паклікаў камісію, якая займецца падрыхтаваньнем да ўрачыстага адсьвяткаваньня юбілею. У склад камісіі ўвайшлі: Купала, Клімковіч, Лынькоў, Александровіч, Галавач і інш.

══ Кампазытар Туранкоў апрацаваў для Дзяржаўнай Капэлі БССР пяць народных песень: „Ой, зялёненькі мой дубочак“, „Ты, чырвоная каліна“, „Забалела ты

мая галованька“ і інш., а для ансамбля народных інструмэнтаў напісаў музыку „Беларуская фантазія“.

═ Беларускія савецкія пісьменьнікі перакладаюць на беларускі язык творы Пушкіна. Алесь Дудар пералажыў ужо дзьве часткі „Аўгенія Анегіна“. Пятрусь Глебка працуе над перакладам „Барыса Гадунова“. Аркадзь Куляшоў перакладае паэму „Цыганы“. М. Хведаровіч перакладае „Каўказкі пленьнік“. Уся праца мае быць скончана ў лістападзе месяцы сёлета.

═ Фольклёрная камісія пры Прэзыдыюме Бел. Акадэміі Навук абвесьціла конкурс зьбіральнікаў народнай творчасьці БССР. Зьбіраньню і запісываньню падлягаюць усе віды савецкага і дарэвалюцыйнага фольклёру: песьні, казкі, расказы, частушкі, прыказкі, пагаворкі і т. п. — Запісываць фольклёр можна на ўсіх мовах БССР. У конкурсе могуць браць удзел як паасобныя зьбіральнікі, так і калектывы. Удзельнікі конкурсу, што прышлюць найбольшую колькасьць высокавартасных фольклёрных твораў, найбольш дакладна запісаных, будуць прэміраваны і залічаны сталымі карэспандэнтамі-зьбіральнікамі фольклёрнай камісіі Бел. А. Н. Тэрмін конкурсу ад 1-га красавіка да 1-га лістапада 1936 г. Да палавіны чэрвеня да конкурсу прыступіла 140 асоб. Найбольшая колькасьць запісаў паступае з цэнтральных раёнаў — Магілеўшчыны, Гомельшчыны і Віцебшчыны. — За два першыя месяцы конкурсу прыслана больш 5.000 запісаў фольклёру (у гэтым ліку больш 3.000 тэкстаў частушак, потым ідуць загадкі, прыказкі і пагаворкі, песьні, казкі і інш).

═ 12-га чэрвеня ў Бабруйскім Гарадзкім тэатры Другі Беларускі Дзяржаўны Тэатр адыграў прэм'еру „Вечару водэвіляў“. Праграма вечару — „Пінская шляхта“ Дунін-Марцінкевіча, „Паўлінка“ і „Прымакі“ Купалы. На спэктаклі былі прысутныя Я. Купала, Я. Колас і М. Зарэцкі. Ім наладзіла публіка бурную авацыю.

═ Дзяржаўнае Выдавецтва БССР выдае ў перакладзе на беларускую мову поўны збор твораў вялікага расейскага пісьменьніка Максіма Горкага. Ужо вышлі з друку чатыры тамы, падрыхтаваны да друку XX том., знаходзяцца ў друку VIII, XIX і IX тамы. Апошнім часам выйшлі з друку: апавяданьне для школьнікаў „Дзед Архіп і Лёнька“, аповесьць „Маці“, кніжка „Жыцьцё і прыгоды Максіма Горнага“.

═ Памёрлі Чэстэртон і Максім Горкі. Сёлетняй вясной памёр слаўны англіцкі пісьменьнік Чэстэртон. Пісьменьнік рэпрэзэнтаваў каталіцкую радыкальную думку. — 18-га чэрвеня памёр Максім Горкі, вялікі расейскі пролетарскі пісьменьнік.

Максім Горкі быў ганаровым сябрам Бел. Акадэміі Навук. У 1906 г. М. Г. пераклаў на расейскую мову верш Я. Купалы „А хто там ідзе“.

У паховінах Горкага, якія адбыліся ў Маскве, бралі ўчасьце дзьве беларускія дэлегацыі: — ад Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў БССР і ад Беларускай Акадэміі Навук.

═ 31 траўня і 1-га чэрвеня сёлета ў Варшаве адбыўся языкаведны зьезд дасьледавальнікаў нерасейскіх моваў СССР. Выступаючыя на зьезьдзе рэфэрэнты і ўчасьнікі дыскусіі сьцьвярджалі, што пачынаючы ад 1929 г. расейская бальшавіцкая партыя праз свае органы русыфікуе мовы нерасейскіх народаў СССР. У працах зьезду браў участье і прачытаў рэфэрат дасьледчык беларускай мовы др. Я. Станкевіч.

Выдавец: Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры.

Рэдакцыйная Калегія: др. Ст. Грынкевіч, Ад. Станкевіч, М. Пяцюкевіч, А. Бярозка і Я. Шутовіч.

Адказны Рэдактар: Ян Шутовіч.

Прысланыя кніжкі, часапісы і інш.

Abram Melezin, Ze studjów nad demogeografją Wilna. 1. Gęstość zaludnienia. Вільня, 1936.
Вістник, кн. 5, Львоў, 1936.
Дзвони, кн. 1—5, Львоў 1936.
Наша культура, кн. 5 (14). Львоў 1936.
Назустріч, ч. 10—12. Львоў, 1936.
Обрії, ч. 15—20. Львоў, 1936.
Рідна Мова, ч. 6, 7. Варшава, 1936.
Наш Світ, ч. 4, Луцк, 1936.
Життя і Знання, ч. 4, 5, 6, 7—8. Львоў, 1936.
Нова Хата, ч. 10, 11—12, Львоў, 1936.
Перемога, ч. 2. Львоў 1936.
Sprawy Narodowościowe, № 6. Варшава 1936.
Pax, № 10. Вільня 1936.
Katolik, č. 7, 8, 9, 10. Прага, 1936.
Život, č 7.—13. Прага, 1936.
Der christliche orient in Vergangenheit u. gegenvart. Мюнхэн. 1936.

Ад Рэдакцыі:

Рэдакцыя просіць ПТ сваіх супрацоўнікаў найхутчэй прыслаць літаратурны і навуковы матарыял да друку ў наступныя кніжкі „Калосься“.

ГАДАВІК „КАЛОСЬСЯ“ ЗА 1935 ГОД

(чатыры кніжкі, 236 бачын) можа дастаць кожны, хто прышле за яго складку 2 зл.

„КАЛОСЬСЕ“ павінна быць настольным часапісам кожнага Беларуса!